Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЖНІВЕНЬ 18 1932 г. № 184 (4436).

Год выдаўня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АБ ХОДЗЕ УБОРКІ І ПРАПОЛКІ Ў ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРКАХ СПАЖЫЎКААПЭРАЦЫІ—Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б.

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — У тэрмін скончыць уборку і разгарнуць загатоўкі тэх культур. Р. КРАСЬНЕЎСКІ—Што мы бярэм і ад чаго адмаўляемся ў Янкі Купалы (2-3 стар.). СТРАКОЎСКІ—БССР штаркімі крокамі ідзе да сацыялізму (2 стар.).

АГЛЯД ДРУКУ: Ліст зьмешчан... (2 ст.).

МТС і саўгасы зацягваюць уборку ільну. (1 стар.).

Аздараўленьне вагоннай гаспадаркі—цэнтральная задача падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак (1 стар.).

Дровы—Менску (3 стар.).

Лісты рабселькораў (3 стар.).

Вопыт полацкага Аўтадору—ва ўсе раёны! (4 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Праграма ўраду фон-Папэна (4 стар.).

СССР і капіталістычны сьвет (4 стар.).

Аб ходзе праполкі і ўборкі ў прыгарадных гаспадарках спажыўкаапэрацыі

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

Канстатуючы зусім нездавальняючы ход, а месцамі яўны прарыў у ходзе работ па праполцы і ўборцы ў прыгарадных гаспадарках спажыўкаапэрацыі БССР, што ставіць пад пагрозу збор ураджаю, а гэта значыць і справу снабжэньня рабочых гароднінай, што зьяўляецца вынікам апартуністычнай блізьдзейнасьці Сельгасаб'яднаньня Белкаапсаюзу, недапушчальна няўважлівых адносін раду партыйных арганізацый, недапушчальна малой дапамогі прафсаюзаў, гарсавету, РВК і іншых мясцовых арганізацый, — ЦК КП(б)Б **пастанаўляе:**

а) Папярэдзіць дырэктара Сельгасаб'яднаньня Белкаапсаюзу тав. **Арапчука,** што калі ім ня будзе забясьпечана патрэбная апэрацыйная работа ў прыгарадных гаспадарках па праполцы і ўборцы ўраджаю з безадкладнай ліквідацыяй прарыву, ён будзе прыцягнут да суровай партыйнай адказнасьці.

Абавязаць прэзыдыум БКС неадкладна мабілізаваць 10-12 адказных работнікаў свайго апарату, прымацаваўшы іх да прыгарадных гаспадарак для непасрэднага ўдзелу ў рабоце па арганізацыі праполачнай і ўборачнай кампаніі.

б) ЦСПСБ і мясцовым саветам прафсаюзаў прыняць рашучыя меры, якія-б забясьпечвалі рэальную дапамогу прыгарадным гаспадаркам, шляхам прыцягненьня рабочых і членаў іх сем'яў да работы па праполцы і ўборцы ў прыгарадных гаспадарках, гарантуючы поўнае забесьпячэньне рабочай сілай. У прыватнасьці, мабілізаваць ня менш 15 адказных работнікаў ЦСПСБ і ЦК саюзаў, прымацаваўшы іх да прыгарадных гаспадарак для дапамогі мясцовым арганізацыям па забесьпячэньні праполкі і ўборкі.

в) ГК і РК КП(б)Б гарадоў: Менску, Гомелю, Віцебску, Магілеву, Бабруйску, Барысаву, Воршы, Мавыру, Полацку, Рэчыцы і Жлобіну неадкладна прыняць адпаведныя меры якія ў поўнай ступені гарантавалі-б правядзеньне ўсіх работ па праполцы і ўборцы ўраджаю прыгарадных гаспадарак. У прыватнасьці, вызначыць і прымацаваць да важнейшых каапгасаў членаў бюро парткомаў, а сакратарам РК штодзенна сачыць за ходам работ па праполцы і ўборцы, неадкладна прымаючы неабходныя апэрацыйныя меры.

ЦК КП(б)Б яшчэ раз указвае ўсім партыйным, савецкім, прафсаюзным і каапэрацыйным арганізацыям на тое вялізарнейшае значэньне, якое мае ва ўмовах БССР збор і захаваньне ўраджаю прыгарадных гаспадарак у справе паляпшэньня рабочага снабжэньня і папярэджвае, што ў залежнасьці ад вынікаў правядзеньня ўборкі ўраджаю прыгарадных гаспадарак — будзе расцэньвацца іх работа па правядзеньні аднаго з важнейшых мерапрыемстваў партыі — па паляпшэньні рабочага снабжэньня.

У тэрмін скончыць уборку і разгарнуць загатоўкі тэхкультур

Пасьпяховае правядзеньне ўборкі і пераапрацоўкі ільна і канапель павінна забясьпечыць, ужо ў тэтым годзе вырашэньне ў асноўным праблемы тэхкультур у СССР. Мы павінны поўнасьцю задаволіць патрэбнасьць ільняной прамысловасьці ў ільнавалакне і пяньцы, што мае вялізарнае значэньне ў сувязі з апошнімі пастановамі партыі аб разгортваньні таваразвароту і паляпшэньні снабжэньня працоўных мас вёскі і гораду таварамі шырокага ўжытку.

Паказальнікам таго, якіх посьпехаў мы дабіліся за апошнія гады ў разьвіцьці тэхкультур, можа служыць той факт, што **СССР стаіць на першым месцы па разьвіцьці ільнаводзтва сярод іншых краін.** Спэцыялізаваныя калгасы, саўгасы і МТС зьяўляюцца тэй базай, на аснове якой мы і ў далейшым будзем ісьці ўперад і атрымліваць перамогу за перамогай. Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі зьяўляецца лепшай зарукай нашых посьпехаў.

БССР, як сустаўная частка ўсяго Савецкага саюзу, у гэтай галіне таксама дабіліся вялізарных посьпехаў. Пасевы ільну толькі ў гэтым годзе павялічаны на 30.000 га і даведзены да 270.000 га. Пасевы канапель даведзены да 31.000 га. Аднак, калі мы дабіліся гіганцкіх посьпехаў у справе паширэньня пасеваў і пераапрацоўкі, то гэтага нельга сказаць пра якасьць. Якасьць прадукцыі яшчэ вельмі нізкая.

Барацьба за якасьць ільну і пянькі павінна быць пастаўлена ў цэнтр увагі ўборачнай кампаніі, якая зараз праводзіцца. Усе працэсы ўборкі—вырываньне, абмалот, часаньне, сланьне, мачэньне і пачатковая апрацоўка—павінны быць падпарадкаваны асноўнай задачы—здаць дзяржаве поўнасьцю і ў тэрмін высокай якасьці прадукцыю. Для гэтага ўжо зараз неабходна закончыць падрыхтоўку і арганізацыю пунктаў па першапачатковай апрацоўцы, рамонт машын і інвэнтару, рамонт і падрыхтоўку новых мачыльных ям, загатоўку апалу і г. д.

У сувязі з гэтым апублікаваная 6 жніўня пастанова СНК і ЦК КП(б)Б аб загатоўках ільну і канапель ураджаю 1932 году набывае вялізарнейшае палітычна-гаспадарчае значэньне.

Як на адну з асноўных задач у барацьбе за тэхкультуры, ЦК і СНК указваюць на неабходнасьць змаганьня **за павялічэньне якасьці** валакна і выкананьня плянаў загатовак поўнасьцю і ў тэрмін.

Партыя і ўрад зрабілі катэгарычнае папярэджаньне ўсім арганізацыям аб недапушчэньні паўтарэньня леташніх памылак, якія прывялі да невыкананьня плянаў загатовак. Апартуністычным разважаньням аб нерэальнасьці плянаў загатовак і самацёку павінен быць дан рашучы адпор з самага пачатку кампаніі.

СНК і ЦК у сваёй пастанове абавязалі «партыйныя і савецкія арганізацыі разгарнуць масавую работу сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў, арганізаваць правільнае і шырокае скарыстаньне жаночае працы, мабілізаваць увагу усіх калгасаў, саўгасаў і аднаасобнікаў на барацьбу са стратамі, на высокую якасьць уборкі і апрацоўкі ільну і канапель».

Вось тыя канкрэтныя задачы і шляхі да іх вырашэньня, за ажыцьцяўленьне якіх усе арганізацыі павінны распачаць упартую барацьбу.

Магутным вагаром у справе барацьбы за пасьпяховае правядзеньне ўборкі і пераапрацоўкі ільну і канапель зьяўляюцца ільготы, што прадастаўляюцца ільнаводчым калгасам апошняй пастановай СНК і ЦК КП(б)Б ад 10 жніўня 1932 году.

Ільготы, якія даюць права разьмяркоўваць сярод калгасьнікаў, працаваўшых на засеве, уборцы і пераапрацоўцы ільну, 10 проц. атрыманага валакна пры ўмове выкананьня плянаў загатовак, выдача збожжа, што атрымліваецца ад дзяржавы, і 20-30 проц. збожжа з фондаў калгасаў, якія падлягаюць разьмеркаваньню, толькі тым калгасьнікам, якія працавалі на засеве, уборцы і пераапрацоўцы ільну, і рад іншых ільгот, паказаных у пастанове, павінны быць неадкладна даведзены да шырокіх мас калгасьнікаў. Таксама неабходна шырока папулярызаваць указаньне СНК і ЦК аб тым, што **«прамтавары выдаваць выключна ў залежнасьці ад якасьці здаваемага ільну і пянькі».**

Адначасова раённыя і нізавыя партыйна-савецкія арганізацыі абавязаны павесьці рашучую барацьбу са спробамі кулака і яго агентаў—апартуністаў—правесьці разьмеркаваньне валакна і збожжа ў калгасах па прынцыпе ўраўнілаўкі. Усякія спробы сказіць дырэктывы партыі і некаданьне пераводзіць іх у жыцьцё павінны разглядацца, як простая дапамога кулаку, і атрымліваць рашучы адпор.

Яшчэ большая, чым у мінулым годзе, увага павінна быць аддана ходу ўборкі ільну і тэхкультур у аднаасобным сэктары. Нельга забываць таго, што пры агульным пляне па ўсіх сэктарох з 27.000 тон (у пераводзе на валакно) ільну аднаасобны сэктар павінен здаць 9.550 тон. Па пяньцы—з 16.000 тон 500 тон, ільняным семі—з 21.000 тон 8.500 тон і канапляным семі—з 980 тон 470 тон. Гэтыя даныя паказваюць **неабходнасьць правядзеньня шырокай масавай работы сярод бядняцка-сераднякцкіх мас аднаасобнікаў і мабілізацыі іх на выкананьне зданьняў партыі і ўраду.** З усякай недацэнкай аднаасобнага сэктару павінна весьціся рашучая барацьба. Пры гэтым, як указана ў пастанове СНК і ЦК, усе арганізацыі павінны «забясьпечыць выразную лінію ў дачы цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам».

Посьпех уборкі, пераапрацоўкі і выкананьня плянаў загатовак будзе залежаць ад таго, наколькі будзе зроблен сапраўдны паварот да пытаньняў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. У пастанове СНК і ЦК УсеКП(б) аб уборачнай кампаніі было асобна ўказана, што: **«Арганізацыя працы** ў калгасах павінна забясьпечыць яшчэ ў большай меры, чым гэта мела месца, непасрэдную зацікаўленасьць як кожнай брыгады, так і асобных калгасьнікаў у рэзультатах сваёй работы».

Правядзеньне гэтага ўказаньня мае асаблівае значэньне для ільнаканапляводчых калгасаў. Гэта значыць, што ільна-канапляводчыя раёны павінны, не пакладаючы рук, працаваць над умацаваньнем вытворчых брыгад, над укараненьнем эўдзельчыны, захоўваючы іх пастаянны склад, правоўзначы правільна дырэктывы партыі аб авансаваньні калгасьнікаў, і на справе паказаць кожнаму калгасьніку, што колькасьць і якасьць работы зьяўляецца адзіным вымяральнікам для ацэнкі працадня. Ужо зараз неабходна зьнішчыць усе недахопы ў справе арганізацыі працы і авансаваньня калгасьнікаў.

Трэба адзначыць, што якраз недахопы на гэтых вучастках і зьяўляюцца асноўнымі прычынамі таго, што ўборка тэхкультур па БССР разгортваецца недапушчальна марудна. На 10 жніўня па БССР плян рваньня ільну выкананы толькі **на 7,9 проц.** у той час, як у 1931 г. плян быў выкананы на **13,2 проц.** Як бачым, тэмпы 1932 году ніжэйшыя за леташнія. **Ліквідаваць неадкладна гэта адставаньне—галавая задача ўсіх канапляводчых раёнаў, калгасаў і саўгасаў.**

Пляны ўборкі і загатовак, вызначаныя ўрадам, зьяўляюцца рэальнымі і для выкананьня іх ёсьць усе ўмовы. Задача ўсіх раённых арганізацый на аснове масавай работы і папулярызацыі апошніх пастановаў партыі мабілізаваць шырокія працоўныя масы вёскі на поўнае і сваячасовае выкананьне ўсіх чарговых сельска-гаспадарчых кампаній. Канкрэтнае і штодзеннае кіраўніцтва калгасамі і бязьлітасная барацьба з апартуністычнымі элемэнтамі забясьпечаць нам далейшыя перамогі ў вырашэньні праблемы тэхкультур, далейшы рост даходнасьці і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

МТС І САЎГАСЫ ЗАЦЯГВАЮЦЬ УБОРКУ ІЛЬНУ

ПОЎНАСЬЦЮ НАГРУЗІЦЬ ІЛЬНАЦЕРАБІЛКІ. У БЛІЖЭЙШУЮ ПЯЦІДНЕЎКУ ЛІКВІДАВАЦЬ АДСТАВАНЬНЕ. БЯЗЬЛІТАСНЫ АДПОР АПАРТУНІСТАМ, ЯКІЯ НЕДААЦЭНЬВАЮЦЬ МЭХАНІЧНУЮ ЎБОРКУ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР

ХОД УБОРКІ ІЛЬНУ ПА БССР

	Убрана на 5 жніўня		Убрана на 10 жніўня	
1932 г.	11.293 га	4,2 проц.	21.354 га	7,9 проц.
1931 г.	8.218 „	3,4 „	31.802 „	13,2 „

НАДВОР'Е „ПАДВЯЛО"

У мінулую вясну мы дабіліся правядзеньня сяўбы ільну ў больш раньнія тэрміны. Добрыя кліматычныя ўмовы спрыялі росту і хуткаму высьпяваньню ільну. Лён пасьпеў на 10 дзён раней, чым у мінулым годзе. У ільнаводчых раёнах зараз ужо распачата масавае цераблеьне.

МТС павінны ўбраць па БССР 68.017 га ільну, у тым ліку 51.423 га ў ільнаводчых раёнах. На 10 жніўня МТС убрана па БССР **4.270 га,** у тым ліку **3.320 га** па ільнаводчых раёнах. Тэмпы яўна нездавальняючыя, калі лічыць, што да 25 жніўня асноўная маса ільну павінна быць выцераблена.

Трактарацэнтр і МТС аказаліся непадрыхтаванымі да раньняй уборкі ільну. Надвор'е «падвяло». У радзе МТС, як **Горацкая, Дрысенская, Сіроцінская** толькі ў апошнія дні пляны ўборкі давялі да калгасаў. Кіраўнікі гэтых МТС не мабілізавалі калгасныя масы на раньнюю і сваячасовую ўборку і барацьбу са стратамі. Прыкладам апартуністычнай недаацэнкі раньняй уборкі ў справе барацьбы са стратамі можа служыць Сіроцінская МТС, якая з 1825 га на 10 жніўня ўбрала толькі 10 га. Дырэктар МТС тав. Малашонак наперакор дырэктывам партыі і ўраду даў загад распачынаць уборку ільну толькі 10 жніўня і фактычна цераблеьне пачалося на 15 дзён пазьней. Такія паводзіны дырэктара МТС толькі на руку кулаку, па руку зрыўшчыкам сваячасовай уборкі, апрацоўкі і здачы ільнавалакна дзяржаве.

Няўпасьць у ільнаводчых МТС 846 ільнацерабілак дае магчымасьць значна паскорыць тэмпы цераблеьня. Між тым па радзе МТС мы наглядаем пагардлівыя адносіны да мэханічнай апрацоўкі. Сваю непадрыхтаванасьць, несваячасовае адрэгуляваньне ільнацерабілак, непадрыхтаванасьць ільнацерабільшчыкаў кіраўнікі паасобных МТС прабуюць апраўдаць тым, што «машыны нягодныя». Між тым праверка работы ільнацерабілак «Камсамолка» спэцыяльнымі камісіямі ў Дрысенскім, Горацкім, Асьвейскім і Расонскім раёнах абвяргае гэтыя заявы. Прыкладам можа паслужыць **Дрысенская МТС.**

Калі камісія прыбыла для абсьледваньня работы ільнацерабілак, кіраўніцтва дрысенскай МТС — сакратар парт'ячэйкі **Шакаліда,** старшыня рабачкому **Ткачэнка,** старшы агранам **Цофнас** усё ў адзін голас заўлялі, што «ільнацерабілкі «Камсамолка» ня годны для работы».

Што-ж аказалася? З 57 ільнацерабілак агледжаны і накіраваны ў калгасы былі толькі 32. Рэшта—ня былі нават агледжаны. З тых, што былі накіраваны ў калгасы, ні адна ня была адрэгулявана і таму, зразумела, не маглі і працаваць.

У калгасе **«Чырвоны сьцяг»** пасьля адрэгуляваньня камісія праверыла работу трох ільнацерабілак. На коннай цязе в дрыўляным перадам пры 10-гадзінным рабочым дні і пры двайной зьмене 4-х коняй ільнацерабілка ўбірала 1,92 га. Ільнацерабілка начыста ўбірала ўвесь лён. Пабітых галовак налічвалася толькі дзесятая доля процанту. На трактарнай цязе, пры рабоце трактара на першай хуткасьці ільнацерабілка за 10 гадзін убірала 1,44 га.

Такім чынам, апартуністычная стаўка на тое, што «машыны «Камсамолка» ня годныя», аказалася бітай. Пры гэтым выявілася поўная непадрыхтаванасьць ільнацерабільшчыкаў, з прычыны чаго лён на плянформе блытаецца.

Недаацэнка мэханічнай уборкі і апрацоўкі ільну характэрна ня толькі для кіраўніцтва МТС. Загадчык дрысенскага раёна тав. **Рамашкевіч** таксама робіць стаўку толькі на ручную працу. «Камсамолкі» ня ідуць, машыны «Эдзі» і «Гільштэйна» не бяруць, убіраюць і рукамі—вось яго заява на калегіі Наркамзему БССР. Зразумела, мы ня можам спадзявацца толькі на мэханізаваную ўборку і апрацоўку ільну, але поўнасьцю скарыстаць наяўныя машыны ня толькі трэба, але і абавязкова. Бо толькі ад правільнага спалучэньня ручной і мэханізаванай работы будзе залежыць уборка ільну ў вызначаныя партыяй і ўрадам тэрміны. Трэба быць безнадзейным апартуністам каб не разумець гэтага.

Колькі ільнацерабілак зараз працуе Трактарацэнтр дакладна ня ведае. Вядома толькі адно, што па Асьвейскай МТС з 26 ільнацерабілак падрыхтавана для работы толькі 17, па Дубровенскай МТС в 40 ільнацерабілак адрэгулявана 9, па Ісьцілаўскай —з 76—30, па Лепельскай з 66—54, па Сіроцінскай—з 53 ільнацерабілак 45 не гатовы да работы.

Характэрна, што гэтыя МТС больш за ўсё адстаюць ва ўборцы. Напрыклад, Асьвейская МТС в 1930 га ўбрала 32—1,6 проц. Сіроцінская МТС з 2.285 га ўбрала 53 — 2,3 проц. Дубровенская—з2.605 га ўбрала 131—5 проц. Больш за ўсё адстаюць Бешанковіцкая МТС, якя ўбрала 0,6 проц. ільну і Чашніцкая—0,8 проц.

Толькі дзьве МТС—Сененская і Лёзьнянская паказваюць добры прыклад работы. Яны ўбралі ад 21 да 23 процантаў ільну. Гэтыя лічбы паказваюць, што МТС БССР раньняе пасьпяваньне ільну захапіла зьнянацку. Надвор'е «падвяло» і кіраўніцтва Трактарацэнтру, дзе знаходзяцца людзі, якія мэханічна зраўнiваюць тэрміны ўборкі ў мінулым і ў гэтым годзе. Напрыклад, загадчык вытворчым сэктарам тав. **Тарасаў** лічыць, што «ход уборкі па МТС пакуль ідзе нармальна, асаблівa непакоюцца няма прычын, пакачаем, што нам дасьць гэта пяцідзеўка».

Вось гэтым «пачакаем» трэба зараз-жа абвясьціць бязьлітасную барацьбу, як у самім апараце Трактарацэнтру, так і па ўсіх МТС і вытворчых вучастках.

Ніякіх самазаспакаеньняў!

Тэмпы ўборкі па МТС на сёняшні дзень нас вадаволіць ня могуць. Усякія спробы адтягнуць уборку, парушыць тэрміны, вызначаныя партыяй і ўрадам, і гэтым самым сарваць барацьбу са стратамі павінны сустрэць зьнішчальны адпор з боку партыйных, прафсаюзных арганізацый і ўсёй грамадзкасьці МТС.

Убраць асноўную масу ільну да 25 жніўня—вось лёзунг, які павінна ператварыць у канкрэтныя справы шматтысячная армія рабочых і спэцыялістаў МТС—асноўнага вагара арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, апорных пунктаў сацыялістычнай калектывізацыі на вёсцы і ліквідацыі на яе аснове кулацтва як класы.

З—н.

Лён пачынае перасьпяваць

СІРОЦІНА. Сіроцінская МТС павінна ўбраць у калгасах, што ёю абслугоўваюцца, 1.825 га ільну. Лён пасьпеў ужо даўно, але ўборка яго амаль не распачата—па 10 жніўня ўбраны ўсяго 53 га.

Лён—вядучая культура ў раёне. Уборка яго ў максымальна кароткія тэрміны—асноўная ўмова барацьбы са стратамі.

Кіраўніцтва МТС паказвае прыклад апартуністычнай недаацэнкі раньняй уборкі ільну. Дырэктар МТС т. **Малашонак** самавольна парушыў тэрміны ўборкі і загадаў не пачынаць яе раней 10 жніўня. Замест 8-10 дзён, вызначаных для ўборкі, Малашонак устанаўляе 15 дзён.

Кіраўніцтва МТС да раньняй уборкі ільну зусім не падрыхтавалася. Дагэтуль ільнацерабілкі ня прыведзены ў гатоўнасьць. З 53 ільнацерабілак ні адна не накіравана ў калгасы.

Усе гэтыя агідныя факты выяўлены нядаўна рабселькораўскай брыгадай, але райком партыі па іх не рэагаваў і ня даў адпаведнай ацэнкі апартуністычнай дзейнасьці дырэктара МТС Малашонка. А лён пачынае перастойваць і асыпацца.

Гайаўнёў.

За няпрысылку справаздачнасьці — да адказнасьці

Пастанова Народнага Камісарыяту Зямляробства БССР

Заслухаўшы інфармацыю пасяўбюро Наркамзему і сэктару збожжавых і тэхнічных культур аб апэрацыйнай справаздачнасьці, Народны Камісарыят Зямляробства пастанаўляе:

1. За няпрысылку штодзенных апэрацыйных справаздач аб ходзе ўборкі ільну і падрыхтоўкі да першапачатковай апрацоўкі паставіць пытаньне перад Гарадоцкім РВК аб умацаваньні кіраўніцтва і апарату райза.

2. Загадчыкам **Дрысенскага** і **Лепельскага** райза і інспэктарам па ўліку гэтых раёнаў абвясьціць суровую вымову з пазнаньнем.

3. Папярэдзіць іншых загадчыкаў райза і інспэктароў па ўліку, а таксама дырэктароў сельгастрэстаў і аб'яднаньняў, што ў выпадку неатрыманьня ў бліжэйшыя дні належнага пералому ў справе арганізацыі ўліку і сваячасовай прысылкі апэрацыйных справаздач НКЗБ пасяўбюро па ўсіх устаноўленых і правадзімых сельгасмерапрыемствах будуць прыняты да іх самыя суровыя меры ўзьдзеяньня.

4. Прасіць рэдакцыі газэт «Зьвязда», «Савецкая Беларусь» зьмясьціць гэту пастанову ў друку.

Нам. нар. кам. Зямляробства БССР— МАСЮКОЎ.

Радыёграма рэдактарам раённых газэт

Абавязваем неадкладна ўзмацніць барацьбу газэт за выкананьне плянаў мабілізацыі сродкаў. У кожным нумары абавязкова ход мабілізацыі сродкаў. Увядзеце чырвоную і чорную дошкі сельсаветаў і арганізацый.. Ускрывайце канкрэтных вінаватых у прарывах, паказвайце лепшыя прыклады большавіцкай барацьбы за фінплян.

Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.

Заг. Культпропу ЦК КП(б)Б ЧАРНУШЭВІЧ.

Саўгасы—адсталы вучастак ільнаўборкі

Белільнатрэст яднае тры ільнаводчых саўгасы з плошчай засеянага ільну ў 2.105 гэкт. Лён пасьпеў ужо даўно. Цераблеьне паводле пляну трэба было пачаць у канцы ліпеня. Тэрмін цераблеьня па асобных саўгасах канчаецца (саўгас «Бігосава», Дрысенскі раён, павінен скончыць цераблеьне да 25 жніўня).

З усёй рашучасьцю трэба сказаць, што саўгасы Ільнатрэсту праводзяць цераблеьне ільну надзвычай марудными тэмпамі, што пагражае зрывам сваячасовай уборкі і апрацоўкі ільну.

За паўмесяца ўбрана па трох саўгасах 347 га. Калі ўзяць осьцяць саўгасы, дык убачым наступны малюнак.

Саўгас **«Боркавічы»,** у якім засеяна 1.131 га ільну, **убраў да 13 жніўня толькі 133 га, або 11,7 проц.** Лён у Боркавічах пасьпеў яшчэ да 1 жніўня. Уборку-ж пачалі толькі 5 жніўня. У саўгасе ёсьць 43 ільнацерабілкі, але яны да пачатку ўборкі ня былі адрамантаваны. У выніку уборка была пачата ўручную. **Ільнацерабілкі выйшлі ў поле толькі 11 жніўня.** Такім чынам прычына адставаньня саўгасу «Боркавічы» — непадрыхтаванасьць да ўборачнай кампаніі, спазьненьне з рамонтам ільнацерабілак. Другая, ня менш важная прычына, гэта недахват рабочай сілы. Для нармальнага ходу цераблеьня ільну саўгасу патрэбна штодзенна 564 рабочых, ёсьць-жа толькі 388, або 77 проц. У выніку ўборачныя машыны поўнасьцю не скарыстоўваюцца. 1 трэцяя прычына, — гэта адсутнасьць апэрацыйнага кіраўніцтва ўборкай як з боку трэсту, так і з боку дырэкцыі саўгасу.

У саўгасе ёсьць 5 агрономаў. Уборка мэханізавана. Працуе 40 ільнацерабілак. Здаецца, усё добра. Ільнацерабілак хапае, спэцыялістаў таксама. Але чаму ўборка праходзіць так марудна? Падамо факты. Ільнацерабілка пры трактарнай цяге павінна выцераблець на зьмену 1,4—1,6 га (паводле норм трэсту). Працуе іх у саўгасе 40. Калі нават лічыць, што ільнацерабілка ўбірэ адзін гэктар, дык у дзень павінна быць выцераблена 40 га. Уборка распачалася 5 жніўня. Значыць, да 13 жніўня трэба было ўбраць ня менш, як 360 га, убрана-ж 133 га, або 11,7 проц. Цярэбіцца ў дзень ад 13 да 16 га.

Як відаць, уся справа ў арганізацыі працы і ў кіраўніцтве ўборкай. У «Боркавічах» праца не арганізавана ў адпаведнасьці з 6 указаньнямі тав. Сталіна.

Амаль такое-ж становішча і па саўгасе **«Бігосава»,** які пасьпяхова праведзеў веснавую сяўбу і быў прэміяваны, але з уборкай ільну адстае. Паводле пляну, ён павінен скончыць цераблеьне да 25 жніўня, а на 14 жніўня выцераблена толькі 21,9 проц. ільну. Саўгас **«Горкі»** (Горацкі раён) таксама выцерабіў толькі 21,9 проц., а лён пасьпеў яшчэ ў канцы ліпеня.

Кіраўніцтва трэсту накіравала ў свае саўгасы спэцыяльных упаўнаважаных, якія сядзяць там больш, чым па паўмесяца 1 амаль нічога ня робяць. Аб гэтым сьведчаць марудныя тэмпы ўборкі.

Часу засталося мала. Але, калі ўзяцца з бальшавіцкай энэргіяй за цераблеьне ільну, прарыў ва ўборцы можна ліквідаваць.

Л. Я.

Клубок супярэчнасьцяй у Оттаве

Імпэрская канфэрэнцыя топчыцца ў бязрэзультатных спробах вырашыць непрымірымыя супярэчнасьці паміж ангельскай буржуазіяй і буржуазіяй дамініёнаў. Як вядома, асноўная задача, якую ангельская буржуазія ставіць перад Оттаўскай канфэрэнцыяй — **гэта затрымаць працэс распаду Брытанскай імпэрыі і з дапамогай пераважных тарыфаў стварыць эканамічнае адзінства імпэрыі.** На гэтых шляхах ангельская буржуазія шукае выхаду з крызісу.

Але паміж Англіяй і дамініёнамі існуюць розкія супярэчнасьці. Дамініёны разьвілі ўласную прамысловасьць і стараюцца заблясьпечыць для ня свой уласны рынак. Ангельская буржуазія, наадварот, тармозіць індустрыялізацыю дамініёнаў, імкнучыся ператварыць іх у аграрныя прыдаткі Англіі. Нарэшце, дамініёны маюць моцныя гандлёвыя сувязі з іншымі краінамі, асабліва са Злучанымі Штатамі. Яны заўзята ахоўваюць гэтыя сувязі, баючыся, каб перавага ў карысьць Англіі не нанесла ім удару з другога боку.

Германскі інстытут кан'юнктурных дасьледваньняў падае наступныя даныя аб эканамічных сувязях унутры Брытанскай імпэрыі.

Увоз Вялікабрытаніі ў 1913 годзе складаў **768,7 млн. фунтаў,** з іх 24,9 проц. прыходзілася на краіны, якія ўваходзяць у склад Брытанскай імпэрыі і 75,1 проц. на іншыя краіны. У 1929 годзе агульны **ўвоз** Вялікабрытаніі **складаў 1.189 млн. фунтаў,** прычым **26,5 увозу** рабілася з брытанскіх уладаньняў і 73,5 з іншых краін.

Калі-ж узяць краіны, якія ўваходзяць у склад Брытанскай імпэрыі паміма Вялікабрытаніі (г. зн. Англіі і Ірляндыі), дык у 1913 годзе 44,3 проц. агульнага імпарту гэтых краін прыходзілася на долю Вялікабрытаніі, а ў 1929 г. Вялікабрытанія займала толькі 31,3 проц. імпарту ў гэтыя краіны. Інакш гаворачы, мы маем **рэзкае паданьне долі Вялікабрытаніі.**

У 1913 г. 37,2 проц. вялікабрытанскага экспарту накіроўвалася ў краіны, якія ўваходзяць у склад імпэрыі, а ў 1929 г. — 41,5 проц. У экспарце краін, што ўваходзяць у склад Брытанскай імпэрыі (за выключэньнем Англіі і Ірляндыі), Вялікабрытанія займала ў 1913 г. **41,8 проц.,** а ў 1929 годзе — толькі **31,3 проц.** Зноў такі рэзкае зьніжэньне долі Вялікабрытаніі. Інакш гаворачы, рост зацікаўленасьці дамініёнаў ня брытанскімі, а чужаземнымі рынкамі.

А вось малюнак капітальных укладаньняў Англіі. У Канадзе ўкладзена 512 млн. фунтаў, ці **15,1 проц.** усіх ангельскіх капіталаўкладаньняў. У Аўстраліі — 572 млн. фунт. — **16,9 проц.,** у Індыі і Цэйлоне — 354 млн. фунт. — **10,4 проц.,** у іншых краінах імпэрыі — 480 млн. фунт. — **14,2 проц. Інакш гаворачы, 56,6 проц. ангельскіх капіталаўкладаньняў знаходзяцца ў межах Брытанскай імпэрыі.** Далей геаграфія капіталаўкладаньняў гэткая: у Амэрыцы інвэставана 839 млн. фунт.—**24,7 проц.,** у Эўропе—382 млн. фунт.—**11,3 проц.** і ў іншых краінах — 252 млн. ф. — **7,4 проц.** усіх капіталаўкладаньняў. **Агульная сума ангельскіх інвэстыцый вызначаецца каля 4 млрд. фунтаў.**

Але ангельскія дамініёны паглынаюць ня толькі ангельскія капіталы. Як вядома, ідзе жорсткая барацьба паміж ангельскім і амэрыканскім імпэрыялізмам за цэлы рад краін, якія ўваходзяць у Брытанскую імпэрыю, **у першую чаргу за Канаду.** Канада, хапя і ўваходзіць у Брытанскую імпэрыю, фактычна зьяўляецца эканамічнай **калёніяй амэрыканскага імпэрыялізму.** У Канадзе звыш тысячы фабрык, пабудаваных амэрыканскім капіталам, і толькі 170 фабрык, пабудаваных ангельскім капіталам. Амэрыканскія капіталаўкладаньні перагышаюць ангельскія, прыкладна, **у дзевяць разоў.** У канадзкім імпарце Англія займае, прыкладна, **15 проц.** у той час, як Злучаныя Штаты — **звыш 70 проц.** У канадзкім экспарце Вялікабрытанія займае **25 проц.** у той час, як Злучаныя Штаты паглынаюць амаль **дзьве трэціх гэтага экспарту.** 91 проц. электрычнага абсталяваньня, якое ўвозіцца Канадай, 90 проц. жалезных і стальных вырабаў і машын, 99 проц. аўтамабіляў, 98 проц. сельска-гаспадарчага абсталяваньня, 99 проц. газаліну, 98 проц. бавоўны, якія ўвозяцца Канадай, — прыпадаюць па долю ПАЗШ. Вось чаму амэрыканскі імпэрыялізм надзвычай заўзята сочыць за Оттаўскай канфэрэнцыяй.

Асабліва трэба адзначыць антысавецкія наскокі ў Оттаве. Канадзкія дэлегаты выступалі на Оттаўскай канфэрэнцыі з патрабаваньнем спыніць доступ савецкім прадуктам на ангельскі рынак. Яны карысталіся пры гэтым старой хлусьнёй аб савецкім «дампінгу» і г. д. «Манчэсьцер Гардыян» прысьвяціла спэцыяльную перадавую гэтым антысавецкім патрабаваньням Канады. Газэта зазначае, што спыненьне доступу для савецкіх тавараў на ангельскі рынак пацягне за сабою аўтаматычнае зьмяншэньне савецкіх заказаў у Англіі, г. зн. далейшае зьніжэньне прадукцыі ангельскай прамысловасьці і далейшы рост беспрацоўя». («Кр. Зв.»).

Адкрыцьцё новай ваенна-стратэгічнай паветранай лініі

ВАРШАВА, 16. Сёньня ў Варшаве і Вільні сьвяткуюць адкрыцьцё новай авіяцыйнай лініі, якая **зьвязвае Польшчу з Латвіяй і Эстоніяй.** Рэгулярныя палёты самалётаў польскай грамадзянскай авіяцыі будуць адбывацца па гэтай лініі тры разы на тыдзень. Адкрытая сёньня авіяцыйная лінія зьяўляецца адрэзкам вялікага авіяцыйнага рэйду Саланікі — Бухарэст — Варшава — Вільня — Рыга — Таліін і мае вялікае ваенна-стратэгічнае значэньне.

БССР шпаркімі крокамі ідзе да сацыялізму

БССР — напярэдадні завяршэньня першага пяцігадовага пляну. Да канца пяцігодкі засталося 4 з паловай месяцы. Але ўжо зараз можна падагуліць вынікі пройдзенага пралетарыятам гістарычнага шляху.

XII зьезд КП(б)Б, абгаварваючы дырэктывы па складаньні першага пяцігадовага пляну народнай гаспадаркі і культуры БССР, у сваёй пастанове высунуў рад адказьнейшых задач, ажыцьцяўленьне якіх забясьпечыла вялізарнейшыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва. **Няўхільнае ажыцьцяўленьне правільнай палітыкі КП(б)Б, рашучая барацьба з ухіламі ад генэральнай лініі партыі, начуваны вытворчы энтузіязм шырокіх мас працоўных у выглядзе сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва—важнейшыя вагары сацыяльна-эканамічных зрухаў у народнай гаспадарцы БССР.**

Напярэдадні пяцігадовага пляну БССР была дзяржавай са слаба разгорнутай прамысловасьцю. Пераважнае месца займала сельская гаспадарка. У даваенны час і першыя гады аднаўленчага перыяду асноўная маса прадукцыі належала дробна-саматужнай рамесьніцкай вытворчасьці. Выкананьне пяцігадовага пляну рашуча зьмяніла твар рэспублікі. Амаль у тры разы ўрасьлі асноўныя фонды прамысловасьці. Замест 57.098.000 руб. на 1 кастрычніка 1928 году асноўныя фонды прамысловасьці павялічыліся да 151.157 тыс. руб. на 1 студзеня 1932 году. Рад новых буйных гігантаў—фабрык і заводаў, узброеныя перадавой тэхнікай, уступілі ў строй, зрабіўшы тэхнічны пераварот у прамысловасьці (Гомсельмаш, Асінторф, аршанская ільнячасальня, магілеўская гарбарня, віцебская трыкатажная фабрыка і інш.). Пабудова Асінаўскай раённай электрастанцыі імя Сталіна дала магутную энэргетычную базу для раду прамысловых цэнтраў: Віцебску, Воршы, Магілева і інш.

Прырост асноўных фондаў галоўным чынам іншоў па лініі прамысловасьці групы А (каля 60 млн. руб.): тарфянной, мэталяапрацоўчай, паперовай, лесаапрацоўчай і інш. вытворчасьцей. Прырост асноўных фондаў па групе Б складае каля 34 млн. руб. Рашуча зьмяніліся суадносіны асноўных фондаў лёгкай і цяжкай прамысловасьці. Калі па 1 кастрычніка 1928 году фонды групы А складалі 27.653 тыс. руб., а групы Б—29.445 тыс. руб., то на 1 студзеня 1932 году па групе А яны складаюць 87.123 тыс. руб., па групе Б—64.034 тыс. руб.

Такое павялічэньне асноўных фондаў магчыма было толькі пры няўхільным росьце капіталаўкладаньняў. За гады пяцігодкі капіталныя ўкладаньні ў прамысловасьць складаюць 151.388 тыс. руб., з іх 86.815 тыс. руб. па групе А і 64.572 тыс. руб.—па групе Б. Пяцігадовы план за тры гады і асобны квартал на капіталаўкладаньнях выканан на 69 проц.

Асабліва вялізарныя дасягненьні мае прамысловасьць у выкананьні пяцігадовага пляну па выпуску прадукцыі. Калі ў 1927-28 г. г. валавая прадукцыя прамысловасьці складала 118.327 тыс. руб., то ў 1931 годзе яна павялічылася да 510.906 тыс. руб.: **прырост на 431,8 проц.** Рад галін прамысловасьці за тры гады і асобны квартал перавыканалі пяцігодку па выпуску прадукцыі; сюды ў першую чаргу адносяцца: **тарфяная, мэталяапрацоўчая, дрэваапрацоўчая, скураная, абутковая, швэйная і запалкавая галіны вытворчасьці.**

Сельская гаспадарка БССР на працягу апошніх трох год разьвівалася пад знакам сацыялістычнай рэканструкцыі. Лік саўгасаў і іх пасеўныя плошчы павялічваюцца з году ў год. У 1928 годзе саўгасаў налічвалася 210, у 1931—358. Пасеўная плошча за тры гады ўзрасла з 41.608 га да 115.472 га. Лік трактараў у саўгасах павялічыўся да 626 да канца 1931 году.

Паварот асноўнай масы сялянства на сацыялістычны шлях знайшоў свой адбітак у росьце колькасьці калгасаў. У адносінах калектывізацыі меркаваньні пяцігадовага пляну значна перавышаны. Калі ў 1928 годзе лік калгасаў складаў 611, дык у пачатку 1932 году гэта лічба павялічылася да 9.469 з ахопам 348.673 гаспадарак. Калгасы значна ўзбуйніліся, сярэдні лік гаспадарак на калгас павялічыўся больш, чым у чатыры разы.

Складаньне сродкаў вытворчасьці ў калгасах стварыла моцную базу для разгортваньня сельскай гаспадаркі. Вядучую ролю адыгрывае арганізацыя машынатрактарных станцый, колькасьць якіх на 1 чэрвеня 1932 году складае 59 з 1453 трактарамі. БССР ператвараецца ў краіну мэханізаванай сельскай гаспадаркі.

У выніку павароту асноўнай масы сялянства на сацыялістычны шлях, росту індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, яе тэхнічнага ўзбраеньня, БССР дасягнула вялізарных посьпехаў і замацавалася на сацыялістычным шляху, павышаючы з году ў год пасеўную плошчу асабліва пад тэхнічныя культуры. Сацыялістычны сэктар, асабліва саўгасы, мае значныя посьпехі ва ўздыме ўраджайнасьці, аднак, гэта задача на сёнешні дзень далёка яе вырашана. У галіне жывёлагадоўлі стаіць задача—як мага хутчэй разьвіваць стала на падставе ажыцьцяўленьня мерапрыемстваў, вызначаных пастановамі партыйных і савецкіх органаў.

Нячуваны ўздым прамысловасьці, сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі, няўхільны рост асноўных паказальнікаў усёй народнай гаспадаркі зьявіліся грунтам для рашучага палепшэньня дабрабыту рабочай клясы і шырокіх працоўных мас.

Адным з важнейшых момантаў у выкананьні пяцігадовага пляну зьяўляецца ўмацненьне і пашырэньне пралетарскай базы. Колькасьць рабочых па саюзнай і рэспубліканскай прамысловасьці ўзрасла з 32.130 чалавек у 1928-29 годзе да 68.732 чал. у 1931 годзе. БССР ня мае зусім беспрацоўных. Сярэдняя заработная плата ўсяго наёмнага пэрсаналу ўзрасла на 65,8 проц. параўнальна з 1927-28 гадамі.

Адным з істотнейшых момантаў у ацэнцы палепшэньня становішча рабочай клясы зьяўляецца перавыкананьне паказальнікаў па сацыяльным страхаваньні, пры недавыкананьні адмоўных паказальнікаў — аплата на інвалідзнасьці, сьмяротнасьці і інш. Павялічылася колькасьць больніц, значна ўзрасла сетка санітарна-прафіляктычных устаноў. Насельніцтва БССР бесьперапынна ўзрастае, сьмяротнасьць памяншаецца. Калі ў 1910 годзе на тысячу чалавек памірала ў сярэднім 21,1 чал., дык у 1928 годзе лічба зьнізілася да 14,2, а ў 1931 годзе—да 12,2 чал. Асабліва зьнізілася дзіцячая сьмяротнасьць (ва ўзросьце да 1 году). У 1910 годзе на адну тысячу памірала 195 дзіцей, у 1928 годзе—95, у 1931—82.

Прыведзеныя паказальнікі па важнейшых галінах народнай гаспадаркі, а таксама па становішчы рабочай клясы сьведчаць аб вялізарных дасягненьнях БССР, якія яна мае ў сацыялістычным будаўніцтве. Калі да гэтага дадаць посьпехі, якія дасягнуты ў галіне народнай асьветы, росту культуры пралетарскай на зьмесьце і нацыянальнай па форме, дык шлях, пройдзены рабочай клясай БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, зьяўляецца санраўды шляхам гістарычных перамог.

Падагульваючы вынікі выкананьня пяцігадовага пляну БССР, якія забясьпечваюць ажыцьцяўленьне пяцігодкі за чатыры гады, неабходна зараз-жа на працягу часу, што застаўся, сканцэнтраваць максымальную ўвагу на выкананьні якасных паказальнікаў у прамысловасьці і сельскай гаспадарцы.

Уздым прадукцыйнасьці працы, зьніжэньне сабекошту, барацьба за якасьць прадукцыі, высокі ўраджай у сельскай гаспадарцы на аснове рашучага змаганьня са стратамі, пашырэньне тавараабароту і павялічэньне вырабу тавараў шырокага спажываньня,—усе гэтыя пытаньні—асноўныя ў барацьбе за завяршэньне пяцігодкі за чатыры гады.

Вялізарныя перамогі ў сацыялістычным будаўніцтве сьведчаць пра тое, што пралетарыят БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б — адзіна з баявых атрадаў УсеКП(б) — з гонарам трымае сьцяг перадавой ударнай брыгады сусьветнага пралетарыяту.

СТРАКОЎСКІ.

Увага: Гэты артыкул зьяўляецца ўступным да сэрыі артыкулаў, якія будуць зьмяшчацца на старонках «Зьвязды» на выкананьні БССР першага пяцігадовага пляну.

Аздараўленьне вагоннай гаспадаркі—

цэнтральная задача падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак

НЕПАЛАДКІ НА АРШАНСКІМ АБМЕННЫМ ПУНКЦЕ

На абменным пункце, які арганізован па ст. Ворша Зах., ёсьць шмат непаладкаў. Перш за ўсё пункт адчувае вялікі недахват рабочай сілы, а паўная рабочая сіла вельмі нізкай кваліфікацыі. Напрыклад, 5 жніўня на рамонце вагонаў працавала два чорнарабочых, два падручных сьлесары і тры дахавікі, а хворых вагонаў было 74. Такая работа выклікае затрыманьне вагонаў з грузамі на рамонтных калянах па 6—7 дзён і дрэнную якасьць рамонту.

Манцёр **Савіцкі** ня ведае, што робіцца на пункце, і 5 жніўня даў нарад на выпуск 11 вагонаў з зусім нявыкананым рамонтам. У трох вагонах частка рамонту была зроблена вельмі дрэнна; пасьля шасьцідзённага прастою іх прышлося зноў вярнуць у дэпо.

Рамонтныя кузавы знаходзяцца ад рамотных калян на адлегласьці ў паўтары кілёмэтры і рабочыя амаль палову дня трацяць, ходзячы туды за рознымі запаснымі часткамі і матар'яламі, якія трэба на сабе насіць.

У абмене вагонамі шмат ненармальнасьцяй. Не адчуваецца барацьбы за здачу здаровага вагону. Ёсьць факты, калі кіраўнікі абменных пунктаў Заходніх чыгунак і МББ «па таварыску» дагаварваюцца паміж сабой і прапускаюць зусім хворыя вагоны. 5 жніўня прапусьцілі адзін аднаму па 5 вагонаў. Жлобінскі рамонтны пункт прапускае хворыя вагоны ў бок Магілева, замест аздараўленьня іх у сябе. У выніку вялікія затрыманьні на абменным пункце. За чатыры дні жніўня МББ забракавала 193 вагоны, з іх 130, якія ішлі са Жлобіну.

Бытавыя ўмовы рабочых і адміністрацыі абменнага пункту дрэнныя. Кватэр няма і ніхто аб гэтым не клапоціцца. Жывуць у вагонах, няма ні матрацаў, ні коўдраў. У сталовай даюць абед толькі ў дзенны час. Няма ні сьнеданьняў, ні вячэры.

Усе рабочыя—члены саюзу, а да гэтага часу мясцкому няма. Культабслугоўваньня—нізкага.

Такое становішча прыводзіць да цякучасьці рабочай сілы. Працадзсцыпліна нізкая. Ёсьць спазьненьні, прагулы. Ніхто барацьбы з гэтым не вядзе.

Становішча, якое стварылася, працягвацца далей ня можа. Яно зьяўляецца сур'ёзнай пагрозай асеньня-зімовым перавозкам. Трыкутніку раёну трэба перагледзець згоду з МББ у частцы рамотных калян, аднесеных на паўтары кілёмэтры ад абменнага пункту. Трэба дагаварыцца з Унецкім раёнам аб палепшэньні рамонту вагонаў. Жлобінскі рамонтны пункт павінен зьнішчыць выпадкі пропуску хворых вагонаў у Воршу. Партыйныя і прафесыянальныя арганізацыі павінны разгарнуць масава-выхаваўчую работу на абменным пункце.

Брыгада дружу:

Ржэўскі, Міхайлоўскі, Хламаў.

Віцебскае дэпо дрэнна рамантуе вагоны

Усесаюзны конкурс вагонькіраў не скарыстаны Віцебскім дэпо як сродак сапраўднай барацьбы за аздараўленьне вагоннай гаспадаркі, за павышэньне якасьці рамонту. Ні адзін вымяральнік ня выканан. Якасьць рамонту нізкая. Вагон, які выпушчан з рамонту 28 ліпеня брыгадай тав. **Кавалёва**, меў 9 буйных дэфэктаў. Прышлося адразу вярнуць яго для паўторнага рамонту. Такіх фактаў можна было-б прывесьці больш.

Дзе-ж прычына паўторнасьці?

У конкурс уключылася 250 рабочых. Яны ўзялі на сябе канкрэтныя самаабавязацельствы. Чаму-ж такія зрывы?

Прычына тут у тым, што дэпоўскія арганізацыі ня здолелі ўзначаліць энтузіязм і ініцыятыву рабочых. Не паладжана масава-палітычная работа, няма канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва конкурсам. Да абавязацельстваў рабочых арганізацыі адносьліся фармальна, не забясьпечылі штодзённай канкрэтнай барацьбы за поўную іх рэалізацыю. Усе гэтыя недахопы трэба неадкладна ліквідаваць.

Ангорскі.

Конкурс бяз уліку вынікаў

На Жлобінскім раёне няма правільнага ўліку ходу конкурсу на спэцрамонту паравозаў і вагонаў.

На сёнешні дзень ні райжуры, ні дэпоўскія журы ня ведаюць, як спаборнічаюць цэхі і брыгады. Дэпо панапісвалі нейкія формы для вестак, але ў іх нічога нельга зразумець. Напрыклад, дэпо **Асіповічы** даюць весткі на гаспадарча-разрахунковую брыгаду па рамонце паравозаў на чале з брыгадзірам **Валько** і ў радкох «вынікі гаспадарчага разрахунку» па ўсіх формах пішуць: «Брыгада аб'ядняе все отрасли работы и участвует в сменновстречном ежедневном планировании». Далей той-жа трыкутнік у другой форме, дзе характарызуецца ўся работа дэпо, піша: «Хозрасчетных и вообще бригад по депо нет».

Па дэпо процант паўторнасьцяй 0,78, выпадкаў—3, а брыгада Валько мае 0,23 проц. паўторнасьцяй за адзін выпадак. З гэтага і вылічваюць балы і робяць вывады хто лепшы.

Да чаго можа прывесьці такі ўлік? — Да зьняцьця з конкурсу. А між тым камандыравалі ў Калугу для інструктажу і сакратара журы Луцкевіча і адказных па ўліку з дэпо.

На сёнешні дзень удзельнікі конкурсу ня ведаюць, хто з іх лепш працуе. Журы рабіла два насяджэньні, на абодвух усё разьмяркоўвала—хто і ў якім конкурсе прымае ўдзел, а кіраўніцтва самім ходам конкурсу няма.

Фініш недалёка. Праз дзьве дэкады ўдзельнікі конкурсу спытаюць сваіх выканаўцаў, ужо канчатковых, не гаворачы аб тым, што яны павінны былі ведаць іх кожную пяціднёўку і нават кожны дзень. Хто ім адкажа, калі такое становішча будзе і надалей?

М. Х.

Гомельскае дэпо перавыканала плян спэцрамонту паравозаў

ГОМЕЛЬ. (Па тэлеграфу).

Спэцрамонт паравозаў па дэпо Гомель скончан датэрмінова. 14 жніўня да 13 гадзін прапушчана праз спэцрамонт 38 паравозаў пры заданьні 31, што складае 122 проц. выкананьня. Паравозны парк гатоў да асеньня-зімовых перавозак.

Трыкутнік дэпо: ХРЫСТОВІЧ, СУР'ЕЎ, ПАЛЯНЧЫК.

АГЛЯД ДРУКУ

Ліст зьмешчан...

(«БАЛЬШАВІК БАРЫСАЎШЧЫНЫ»)

29 чэрвеня пад спэцыяльным загалоўкам **«Лісты рабочых»**, «Бальшавік Барысаўшчыны» ў першы раз зьмяшчае чатыры лісты. Рэдакцыя ўзяла правільны курс. Пад лістамі, у якіх рабочыя выкрываюць бюракратызм, дающа заўвагі ад рэдакцыі з патрабаваньнем хутчэйшага рэагаваньня па сутнасьці фактаў, указаных у заметках. Ліст «Дробязі зьядаюць сотні рублёў» завастрае ўвагу гарадзкога камбінату на недапушчальнасьць страт з-за нядбайнасьці. Гэты ліст зьяўляецца асабліва каштоўным, бо ўказвае шляхі зьнішчэньня страт.

Першыя «ластаўкі» на старонках «Б. Б.» паказваюць вялікую творчую актыўнасьць рабочых, іх гатоўнасьць змагацца з усякімі недахопамі. Такі матар'ял мае надзвычайную каштоўнасьць і зьмяшчэньне яго ў газэце зьяўляецца актуальнейшай задачай рэдакцыі.

«Б. Б.» лісты атрымлівае штодзённа і ў вялікай колькасьці. Але-ж з самага пачатку «Б. Б.» ня ўніклуў памылак і промахаў у гэтай справе.

Газэта дае лісты не сыстэматычна. Газэта не канцэнтруе лістоў, а дае іх раскідана.

Думка аб тым, што лісты рабселькораў могуць ісьці самацёкам,—у корані няправільная. Аддзел рабселькораўскіх лістоў, як і ўся газэта, маюць мэтай паказваць пэўныя вучасткі работы, узьнімаць закранутыя пытаньні на прынцыповую вышыню. Гэтага нельга дабіцца пры адсутнасьці сыстэмы і апэрацыйнасьці ў рабоце.

Скаргі і прапановы рабселькораў, якія нападаюць у рэдакцыю ў выглядзе лістоў, павінны атрымліваць самае хуткае вырашэньне. У гэтым зарука росту аўтарытэту газэты.

Мы ўжо адзначалі, што з 29 чэрвеня газэта зьмяшчае лісты ў спэцыяльным аддзеле. З таго часу прайшло бяз малага два месяцы. За гэты тэрмін рэдакцыя не зьмясьціла ні аднаго адказу на лісты.

12 ліпеня «Б. Б.» зьмяшчае ліст калгасніка Кучынскага Васіля, які піша:

> **«Калі ў нашай вёсцы арганізаваўся калгас «Чырвонал студзёнка», я першы запісаўся ў яго і пачаў праводзіць актыўную работу па наладжаньні ўсёй працы ў калгасе...**
>
> **... Тады калгасьнікі, б. заможнікі, як Вераміей, Валасевіч, Мядзель Міхась і старшыня калгасу Фёдар Шмідт, б. унцер-афіцэр пачалі весьці работу, каб мяне выключыць з калгасу. Зэраз я не ў калгасе і жыву два месяцы без работы».**

Да гэтага ліста рэдакцыя дае сваю зўвагу:

> **«Рэдакцыя «Б. Б.» патрабуе ад райкалгассаюзу неадкладнага рэагаваньня на ліст Васіля Кучынскага. Вінаватыя ў цеганіне павінны быць прыцягнуты да адказнасьці».**

21 ліпеня пад загалоўкам «Вышэй клясавую пільнасьць» у газэце ідзе цэлы «падкал» аб здзеках заможнікаў над калгасьнікам Кучынскім. Артыкул канчаецца словамі:

> **«З гэтай справы тэрміновыя вывады павінны зрабіць райкалгассаюз і судовыя органы».**

Пару слоў адносна канцовак. Рэдакцыя ў першым выпадку патрабуе, каб «вінаватыя ў цеганіне» былі «прыцягнуты да адказнасьці».

Зусім невядома, што гэта за «цеганіна». Нідзе ня відаць, што справа Кучынскага—гэта проста цеганіна. Наадварот, тут не цеганіна, а наглыя здзекі заможнікаў над бедняком-актывістам.

У даным выпадку гэта заўвага рэдакцыі, што кваліфікуе здзекі кулакоў над бедняком толькі цеганінай,—палітычна няправільная і шкодная.

Калі ў першым разе рэдакцыя патрабуе рэагаваньня па справе Кучынскага, то ў другі раз яна толькі кажа, што тыя-ж органы павінны рэагаваць. «Добрая «настойлівасьць»!

За ўвесь час (ад 29 чэрвеня) «Б. Б.» зьмясьціў 25 лістоў. За гэты-ж час мы ня бачым ні аднаго выніку расьсьледваньня. 25 рабселькораў напэўна будуць думаць таксама, як і Кучынскі, што рэдакцыя ня здольна дабіцца адказу на іх лісты.

Месячнік дабрабыту г. Менску

Вадаканал хаваецца за „аб'ектыўныя прычыны"

14 жніўня адбылося чарговае насяджэньне гарадзкога штабу па правядзеньні месячніка дабрабыту г. Менску. На насяджэньні выявілася, што некаторыя гаспадарчыя арганізацыі зусім не разгарнулі работы па правядзеньні месячніка. Так, **Вадаканал**, які па дагаворы з Менгарсаветам да 1 верасьня павінен правесьці лічбевую каналізацыю на **Савецкай, Ленінскай** і **Інтэрнацыянальнай** вуліцах, зусім нічога не зрабіў, каб выканаць гэта заданьне. Дырэктар Вадаканалу тав. **Станкевіч**, замест разгортваньня работы, займаецца вышукваньнем розных «аб'ектыўных» прычын. Ён лічыць, што зробленыя менскім ботонным заводам трубы не падыходзяць для каналізацыі з тае прычыны, што ня вытрымаюць адпаведнага напору. Між тым, па заключэньні спэцыялістаў трубы цалкам прыгодны і могуць быць скарыстаны. Такой-жа беспадстаўнай прычынай зьяўляецца разважаньне **Станкевіча** аб адсутнасьці рабочай сілы. На справе-ж высьветлілася, што Вадаканал замест нагрузкі рабочых, якія ў яго ў свой час былі, пэўную частку зусім распусьціў.

Ня лепш справа і з электрастанцыяй, якая за час месячніка павінна зьняць электрычныя слупы на вуліцах **Варашылава, 11 ліпеня, Гарбарнай, Энгельса, Чырвонаармейскай і Камуністычнай** і павесіць 200 вулічных ліхтароў. Да гэтай работы электрастанцыя амаль не прыступіла. Намесьнік дырэктара тав. **Бегін** запэўніў, што да 16 жніўня будуць зьняты слупы і павешаны 25 ліхтароў толькі па вуліцы Варашылава, г. зн. адна чацьвертая частка тае работы, якую электрастанцыя павінна прарабіць за час месячніка.

У свой час на сходзе жактаў г. **Менску** была прынята пастанова аб арганізацыі збору каменьняў. Кіраўніцтва гэтай работай ускладзена на гаржысаюз у асобе яго старшыні тав. **Модліна**. Аднак, на сёнешні дзень ні адзін з жактаў не прыступіў да зборкі каменьняў.

Трэба адзначыць, што ня ўсе цэнтральныя арганізацыі дапамагаюць Менгарсавету ў палепшэньні дабрабыту гораду. **Галоўдартранс**, згодна пастановы СНК БССР і заключанага дагавору, павінен быў даць гарсавету для брукаваньня вуліц прадукцыю першага гатунку гомельскага клінкернага заводу. Між тым горны аддзел Галоўдартрансу аддаў загад заводу здаваць прадукцыю іншым арганізацыям. Гэта распараджэньне на сутнасьці зрывае перабрукаваньне клінкерам вуліц Менску.

Ня гледзячы на неадназовыя сыгналы друку і пастановы гарсавету аб узмацненьні работы асэнізацыйнага абозу, праца яго дагэтуль не наладжана. Ён-як сьлед ня ўключыўся ў правядзеньне месячніка. З паўных 50 двухконных бочак на працу выяжджае толькі ня больш 20. Кіраўнікі абозу спасылаюцца на недахват коняй у той час, калі ёсьць 92 рабочыя кані, якія поўнасьцю не выкарыстоўваюцца.

Р.

Р. КРАСЬНЕЎСКІ

ШТО МЫ БЯРЭМ І АД ЧАГО АДМАЎЛЯЕМСЯ Ў ЯНКІ КУПАЛЫ*)

(Да 50-цігодзьдзя з дня нараджэньня)

Другі пэрыяд у творчасьці Я. Купалы ў адрозьненьне ад першага, народна-дэмакратычнага, адкрываецца зьяўленьнем «Адвечнай песьні» і «Сну на кургане» (1913 г.). Гэта пэрыяд «клясычнага напаніўства», характэрнага тым, што матэрыялізм і дэмакратызм Купалы зьмяняецца ідэалізмам і сымбалізмам, ідэя нацыянальнага вызваленьня—містыфікаваным нацыяналізмам. У гэтых творах мы прысутнічаем пры нейкім шабашы вядзьм, чарцей, мерцьвякоў, лясуноў, вяшчуноў і г. д. Адкуль усё гэта ў Купалы? Вось тут мы падыходзім да пытаньня, чым была тая ідэалёгія, якая атрымала назву так званага напаніўства. Падобна таму, як «Наша ніва», зьяўляючыся буржуазна-рэакцыйным органам, таксама вельмі сымбалістычна адносілася да беларускага народу, пісала яго з вялікай літары, падобна гэтаму беларуская паэзія часоў рэакцыі таксама ўсё больш адыходзіла ад рэальнага дэмакратызму. Уласна кажучы, яна пераходзіла на пункт гледжаньня тэй часткі рэакцыйна-настроенай гарадзкой і сельскай буржуазіі, аб якой Левін гаварыў, што яна з працятам рэвалюцыі «пачынае разумнець», супакойваецца, паварачваецца ў бок контр-рэвалюцыі, каб выбіць уладу з рук пралетарыяту і сялянскай беднаты, якая спачувае пралетарыяту» (т. VIII, стар. 424).

Гэты паварот так званага напаніўскага руху знайшоў свой адбітак у літаратуры ў праяўленьнях агульна-расійскага дэкадэнсу (упадніцтва). Для нас не падлягае сумненьню, што Я. Купала таксама аддаў яму дань, у выглядзе панаваньня ідэалізму, напаўпрыгоды і містыкі ў яго творах таго часу. У сувязі з гэтым нельга не закрануць хаця-б коратка пытаньня аб сацыяльна-палітычнай прыродзе ідэалёгіі «Нашай нівы». Усім ужо ведома яго славутая праграмная заява аб тым, што «Наша ніва» служыць ня толькі адным мужыком, але і паном і мужыком». Гэта цынічная, але зусім праўдзівая заява беларускіх акцябрыстаў абшарнікаў і прадстаўнікоў контр-рэвалюцыйнай нацыянальнай буржуазіі. Вось як у 1913 годзе, калі пачынаўся новы ўздым рабочага руху, пісала «Н. Н.» пра рабочыя забастоўкі.

> «Вынік гэтай палітыкі, (забастовак, Р. К.,—пісала «Н. Н.»—дужа благі: забастоўкі зацягваюцца, народ ды прамысловцы (слухайце!) руйнуюцца, а разам з імі бяднее старана і падае народная гаспадарка ў Расіі» (з перадавой «Работніцкая палітыка»).

Ці можна зараз сумнявацца ў тым, што «Н. Н.» і напаніўства наогул у сэнсе прад стаўніцтва клясавых інтарэсаў адкрыта абаранялі інтарэсы абшарнікаў і капіталістаў? Таму «Н. Н.» і напаніўства было аб'ектыўна органам і ідэалёгіяй буржуазна-памешчыцкіх элемэнтаў на Беларусі, ці прадстаўнікамі сталышінска-прускай сыстэмы.

***

Я. Купала зьвяртаючыся да «Нашай нівы» казаў, што «зерне кінутае ў ніву ўсходзіць ды красуе». Нельга сказаць, што тут выказалася адна наіўнасьць няведаньня таго, чым была ў сапраўднасьці «Наша ніва»; скажам больш, што тут ёсьць і непасрэдныя элемэнты апалёгіі напаніўцаў. Вось гэта і ёсьць той самы адмоўны ўплыў, які адбіўся ў творах Купалы пэрыяду рэакцыі і пасьля яго.

У чым філёзофія «Адвечнай песьні» або «Раскіданага гнязда»? Па форме ў іх, як быццам, па-ранейшаму трактуецца «вечны» лёзунг сялянства пра вольную зямлю і вольную бацькайшчыну. **Але толькі па форме.**

У сваёй-жа глыбокай філёзоўскай сутнасьці гэтыя творы рэакцыйны, бо красякнуты ідэалізмам і містыкай. У «Адвечнай песьні» Янка Купала ўводзіць «бяздольнае жыцьцё» **мужыка, яго хрысьціянска-таўстоўскае мысьленьне** на абсалютны біялёгічны і сацыяльны закон «іжэ не пройдзешы».

Сэнс гэтай філёзофіі набліжаецца да вядомай біблейска-хырсьціянскай сапрамэнтальнай формулы: «аб пракляцьці роду чалавечага». На самой справе заключныя словы «Адвечнай песьні», якія гаворыць «Цень мужыка», паўстаўшага з магілы, нямногім розьняцца ад памянёнай формулы:

> Нямёла мне слухаць, нямёла
> З зямлі маёй гэткі прывет,
> Раскрыйся нанова магіла,
> Страшней цябе людзі і сьвет.
> (т. IV, стар. 128).

Апошнія словы ёсьць квінтэсэнцыя філёзофіі «Адвечнай песьні». Рэлігійна-хрысьціянскі характар яе не падлягае сумненьню.

Пасьля таго, што мы сказалі пра філёзоўскі эквівалент «Адвечнай песьні», нам застаецца вельмі мала чаго новага сказаць пра другі ідэалістычны твор Купалы «Сон на кургане». Тут, як і ў першым выпадку, тая-ж самая глыбока ўпадніцкая, «сымбалічная» філёзофія.

«Раскіданае гняздо»—гэта завяршэньне сымбалічнага цыклю, якім Купала ў ідэалістычна-містычнай форме даў адказ на праблему «Вольнай бацькаўшчыны». Апошні твор, праўда, пазбаўлены таго крайняга філёзоўскага пэсымізму, які мы назіралі ў двох першых. (Мы лічым, што тут сказаўся новы рэвалюцыйны ўздым, што пачынаўся з 1912 году). Аднак-жа, чытач дарэмна будзе шукаць у драме тых дзейных сіл, якія маглі-б змагацца за новае жыцьцё, за «бацькаўшчыну», як піша аб ёй Купала. Вострая калізія драмы—зруйнаваньне сялянскай гаспадары панам-абшарнікам, аднак, вырашаецца ў драме традыцыйна: «Нахай заворваюць! Іх зямля—іх права». У гэтых словах Лявона—зруйнаванага гаспадара—знаёмае, чыста таўстоўскае вырашэньне праблемы зямлі. Сымон, спачатку бунтар-анархіст—нарэшце таксама становіцца на пункт гледжаньня пакорлівасьці закону. Ранейшая вострая на навісьць да панаў тут зьмяняецца мягкім элёгізмам «пяшчаснага каханьня» сялянкі Зоські да паніча. Няма ранейшай Купалавай непасрэднасьці, рэалістычнасьці, народнай простасьці ў паказе «безьзямельнай долі» шырокіх пластоў сялянства. Чаму? Таму, што ў гэты час Купала, бязумоўна, знаходзіўся пад моцным уплывам рэакцыйнай нашаніўска-«прусацкай» ідэалёгіі, якая ўжо даўно пакінула выказваць інтарэсы сялянства і дэмакратыі, захаваўшы толькі некаторую, чыста сымбалістычную, ліберальную фразэалёгію пра «народ», «волю», «бацькаўшчыну» і г. д. Да таго-ж клясавыя суадносіны ў гэты час (1910—1913 гады) былі іншымі, чым раней: пралетарыят зноў узьняўся на барацьбу, сялянства ўсё больш выразна разьмяжоўвалася на буржуазію, серадняцтва і на пупаралетарыят, прычым сацыял-дэмакратычны, пралетарскі ўплыў па бядняцкую і пралетарскую частку вёскі ўсё больш узрастаў.

Купала, які, знаходзіўся ў зачараным коле ідэалёгіі «артадаксальнага нашаніўства», не заўважаў рэальных зрухаў у сацыяльна-гістарычным жыцьці краіны, ня бачыў тэй адзінай сілы, якая магла вывесьці сялянства на шлях барацьбы і перамогі пралетарыяту гораду, які зноў станавіўся тады на чале рэвалюцыі. Горад і пралетарыят для Янкі Купалы на працягу ўсяго часу, аж да пралетарскай рэвалюцыі, заставаліся нейкай «фэрра інкогніто» (невядомай галінай).

Паўтараем, мы ня ставім у асабістую віну Купале таго, што ён быў далёкім ад тэй глебы, на якой вырастала і фармавалася новая рэвалюцыйная сіла ў выглядзе гарадзкога пралетарыяту Беларусі, з новым сьветапогляданм на жыцьцё. Мы толькі канстатуем гэты факт і тое, што вынікае з гэтага факту для творчасьці паэты. Адным-жа з гэтых вынікаў былі ідэалізм, містыка і пэсымізм, характэрныя для творчасьці Купалы эпохі рэакцыі. Ня гледзячы на фармальныя якасьці гэтых твораў, мы, аднак, ня можам лічыць іх **ні лепшымі, ні нават арыгінальнымі творамі.**

У гэты пэрыяд творчасьці Купала аддаў дань і шавінізму, які ахапіў дробна-буржуазную інтэлігенцыю ў пачатку вайны. У 1914 годзе ён зьмяшчае ў «Нашай ніве» (№ 40) верш «Песьні вайны», які адзначаецца ўра-патрыятычным настроем:

> **Устань! Устань тачыць штыкі!**
> **Знаёмы шоўкавы сьвяціць!**
> **Яшчэ жыве закон такі —**
> **За сьмерці сьмерцямі плаціць**
> **Адважна ў бой!.. і г. д.**

Гэты верш паказвае як далёка не розумеў Купала **імпэрыялістычнага** характару вайны (ды паогул эпохі імпэрыялізму), якая менш за ўсё мела на мэце «волю вольнай грамадзе». Вось чаму па працягу вайны паэта, хоць і ня пісаў, здаецца, больш падобных ура-патрыятычных вершаў, затое і на мог стварыць амаль нічога моцнага антываеннага: пацыфізм, элёгізм, журба—вось дамінуючая нота яго нямногіх «ваенных» вершаў. Чаму? 1 тут адбіўся ўплыў на Купалу рэакцыйнай сацыяльнай філёзофіі «нашаніўства», якое ў часе вайны было звычайнай «беларускай фракцыяй», агульна-імпэрскага патрыятызму і шавінізму.

***

1917 год наогул ня выклікаў у паэты творчага ўздыму і не пакінуў прыкметных арыгінальных сьлядоў у яго паэзіі. Для нас-жа нясумненна тое, што прычыны тут былі ідэйна-клясавага парадку. Янка Купала—прадстаўнік дробна-буржуазнай дэмакратыі, прасякнут ідэалізмам і нацыяналізмам, зразумела, ня мог усьвядомець сутнасьці барацьбы і рэвалюцыі пралетарыяту, вясковай беднаты (невыпадкова, што Купала ўжо ў 1925 годзе гаварыў аб рабочым, што ён «любач з сялянамі за ланцуг свой мсьціў ся» (т. VI, стар. 1641). Ён ня бачыў таго, што «народ» ужо даўно страціў свой «паза клясавы» характар, падзяліўшыся на адкрытых прыхільнікаў і ворагаў рэвалюцыі—па буржуазію, памешчыкаў і кулакоў, з аднаго боку, і пралетарыят, вясковую беднату і рэвалюцыйных салдат—з другога. Першая частка «народу», з якім зьліваліся ўсе так званыя дэмакраты, выступала супроць другой—сапраўды беларускага народу, беларускіх рабочых і сялян, натхняючы розныя акупацыі, паўстаньні супроць рэвалюцыі, распаўсюджваючы ідэі рэакцыйнага нацыяналізму.

Янка Купала, як паэта, займаў сваю пазыцыю ў гэтых супярэчнасьцях клясавай барацьбы, ня зьліваючыся цалкам з нацыяналістычна-буржуазным лягерам. У часы нямецкай акупацыі, напрыклад, ён пісаў:

> «Табе, народ мой, згібнуты ў аковах
> З-пад сэрца песьню гэтую пяю...
> ... Чужак—дэйчук, крывёю ўпіўшысь,
> Запрог цябе ў жаволю, у батракі...».

Свой верш ён канчаў тады заклікам: «Паўстань народ! Прачнеся беларусе!». Гэта, зразумела іншыя настроі за тыя, якія несла пралетарская рэвалюцыя. Тым ня менш мы адзначаем іх прагрэсыўнасьць у параўнаньні з поўным маразмам, здрадніцтвам і рэпэгацтвам «таварыства Лёсік, Луцкевіч і К°», што гандлявала «беларускім народам» ва ўсіх перадавых буржуазных міністэрствах Эўропы.

***

Канец 1918 году—гэта пэрыяд гераічнай барацьбы Чырвонай арміі рабочых і сялян Беларусі з акупантамі Доўбар-Мусьніцкага і кайзэра Вільгельма. Гэта барацьба скончылася перамогай рэвалюцыі і ўрачыстым—1 студзеня 1919 году—абвяшчэньнем незалежнай Беларускай Савецкай Сацыялістыч

Дровы—Менску

„Хлеба не чакайце...рыбы ня будзе...гародніны не атрымаеце...“

13 жніўня пры Лесбеле адбылася нарада дырэктароў леспрамгасаў, якія загатаўляюць дровы для Менску. На нарадзе былі падведзены вынікі работы па загатоўцы і вывазцы дроў пралетарскаму цэнтру.

Згодна пляну, у гэтым годзе Менску вызначана 22.000 вагонаў дроў. З данай колькасьці па лініі Менгартопу павінна быць завезена 15.000 вагонаў. Паводле каляндарнага пляну на 1 ліпеня трэба было адгрузіць 7.500 вагонаў, фактычна-ж адгружана толькі 5.900. На 1 жніўня, згодна пастановы ЦК КП(б)Б, завоз дроў павінен быў быць даведзен да 12.000 вагонаў, або 80 проц. гадавога заданьня. Фактычна-ж Менск атрымаў па лініі Гартопу толькі 6.693 вагоны, або 47,2 проц. гадавой праграмы. Запазычанасьць на 1 жніўня складае 5.307 вагонаў.

Для таго, каб забясьпечыць поўнасьцю Менск апалам, да 1 кастрычніка неабходна завезьці 9.500 вагонаў дроў: па лініі Гартопу—8.307 вагонаў, па лініі лесснабсбыту для прамысловасьці—1.193 вагоны. Зараз на чыгунцы знаходзіцца ня больш 1.500 вагонаў, астатнія дровы — у лесе, поўнасьцю загатоўлены. Такім чынам, зараз асноўная задача — у сваячасовай вывазцы і падачы вагонаў да месца пагрузкі. Між тым, чыгунка ня выконвае заявак на падачу патрэбнай колькасьці вагонаў. Дырэкцыя кіраўніцтва Заходняй чыгункі зацьвердзіла плян на падачу штодзённа 77 вагонаў, фактычна падаецца ў сярэднім ня больш 14 вагонаў. У першай дэкадзе жніўня зусім не падалі вагонаў станцыі: Асіповічы, Берайцы, Сьвіслач, Астанкавічы.

На нарадзе асобныя кіраўнікі леспрамгасаў імкнуліся даказаць немагчымасьць выконваньня пляну адгрузкі дроў. Многія чакалі пакуль забяруць дровы, якія падвезены да чыгункі, і зусім спынілі вывазку. Асіповіцкі леспрамгас, на які прыпадае 40 проц. агульнай колькасьці дроў для Менску, выканаў сваё заданьне па вывазцы толькі на 28 проц. Намесьнік дырэктара тав. Гельфанд у сваім выступленьні шукаў для сябе апраўданьняў:

— Я ў Асіповічах зусім нядаўна,—кажа ён,—ня ведаю з чаго пачынаць. У нас вялікая запазычанасьць па заработнай плаце. Аб выкананьні пляну вывазкі дроў зараз цяжка што-небудзь сказаць.

Прадстаўнік старобінскага леспрамгасу тав. Тацько замест арганізацыі працы вочлікаў, з мэтай павышэньня іх заработнай платы, увесь час дабіваецца мэханічнага павялічэньня ставак.

— Хочаце дроў, дабаўце 60 проц. заработку па кожны кубаматр,—заяўляе ён. Выступленьню Тацько з боку нарады дан рашучы адпор. Але гэтага мала. Трэба, каб такі гора-кіраўнік неадкладна быў заменен больш здольным.

Сакратар менскага гаркому КП(б)Б тав. Шпэктараў завастрыў увагу нарады на сур'ёзнасьці становішча з забясьпячэньнем дровамі прадпрыемстваў гораду Менску. І толькі пасьля гэтага спрэчкі прынялі дзелавы характар. Дырэктар жыткавіцкага леспрамгасу тав. Герасімовіч, даючы рашучы адпор рвацкай тэндэнцыі Тацько, заявіў:

— У першым паўгодзьдзі, ня гледзячы на ўсе труднасьці, наш леспрамгас поўнасьцю выканаў плян па загатоўцы дроў. Заданьне па адгрузцы дроў Менску будзе выкалана. 12 тысяч раўмэтраў дроў надвезена да чыгункі. Засталося вывезьці 20 вагонаў...

На нарадзе шмат гаварылі аб тым, што лесарабкопы працуюць дрэнна. Бываюць выпадкі, калі пастаянныя вочлікі на некалькі дзён не атрымліваюць хлеба. Прадстаўнік Заслаўскага леспрамгасу тав. Кіруцтэйн у сваім выступленьні сказаў:

— Мы атрымалі ад Лесбелу паведамленьне аб тым, што нам запаражана тры тоны хлеба. У той-жа дзень лесасэкцыя паведаміла, што гэта хлеб ня наш, а другіх арганізацый. Даны факт сьведчыць пра тое, што паміж Лесбелам і лесасэкцыяй адсутнічае ўсякая ўвязка ў рабоце.

Дырэктар Пятрыкоўскага леспрамгасу тав. **Леўчанка** ў сваім выступленьні спыніўся на недахвацэ рабочай сілы, па нерацыянальным скарыстаньні ўласнага транспарту.

— Рабочы ідзе туды,—гаворыць т. Леўчанка—дзе добра працуе каапэрацыя, сталоўка. Мы гэтым пахваліцца ня можам. Ад нас уцякаюць рабочыя.

Удзельнікі нарады на ўсе свае запатрабаваньні чакалі выразнага адказу. На жаль яго ня было. Прадстаўнік лесасэкцыі тав. **Ігнатовіч** заявіў літаральна наступнае:

— **Хлеба не чакайце. Рыбы ня будзе. Гародніны не атрымаеце.**

Незразумела, чым будзе займацца лесасэкцыя ў бліжэйшы час. Самазагатоўкі не разгорнуты. Шмат гавораць аб будаўніцтве сьвінарнікаў, абораў і трусатнікаў, але справа далей гаварыльні ня рушыцца. Нескарыстаны і такія магчымасьці, як стварэньне рыбных гаспадарак пры лесрабкопах.

Лесбелам не адпушчаны сродкі на будаўніцтва сьвінарнікаў, гародніна-хавальнікаў. Асобныя леспрамгасы прымушаны скарыстоўваць на гэта зваротныя сродкі, чым парушаецца фінансавая дысцыпліна, ствараюц па труднасьці з выплатай зарплаты лесарубам і возчыкам (**Асіповічы, Бабруйск, Чэрвень**).

З выступленьняў удзельнікаў нарады было відаць, што 6 гістарычных умоў тав. Сталіна не знайшлі выстарчальнага праламленьня ў практычнай рабоце лясной прамысловасьці. Прафсаюзныя арганізацыі ў большасьці леспрамгасаў пінкай мэсавай і палітвыхаваўчай работы сярод пастаянных возчыкаў не праводзяць. Надзвычай марудна перабудоўваецца работа па абслугоўваньні бытавых умоў рабочых. Дрэнна працуюць сталоўкі. Адсутнічаюць жылыя памяшканьні для рабочых-возчыкаў.

Правільна адзначыў у сваім выступленьні старшыня гарпрафсавету тав. **Шулькін**, што прафсаюзныя арганізацыі мала дапамагаюць леспрамгасам у барацьбе за ажыцьцяўленьне ўказаньняў тав. Сталіна, за выкананьне пляну загатоўкі і вывазы дроў.

— Для практычнай дапамогі ў загатоўцы і вывазцы дроў Менску,—заявіў **тав. Шулькін**,—мы ў бліжэйшы час пасылаем сваіх работнікаў у леспрамгасы...

Лесбел толькі цяпер вылучае свайго работніка, які будзе адказваць за загатоўку і вывазку дроў для Менску. Раней аб гэтым ён і ня думаў. Аднак, будзе зусім няправільна калі Лесбел абмяжуецца выкананьнем пляну па адгрузцы дроў толькі для Менску. Трэба таксама змагацца за забясьпячэньне апалам рабочых цэнтраў: Гомелю, Віцебску, Барысаву, Бабруйску і інш.

Раённыя партыйныя, савецкія і прафсаюзныя арганізацыі павінны дапамагчы леспрамгасам забясьпечыць адпаведныя тэмпы ў рабоце.

А. М.

На ўсебеларускай нарадзе інструктароў-мэтадыстаў і загадчыкаў узорных школ

13 жніўня гэтага году ў Менску распачала работу ўсебеларуская нарада інструктароў-мэтадыстаў і загадчыкаў узорных школ. Мэта нарады—падрыхтоўка па мэтадычных пытаньнях да раённых настаўніцкіх канфэрэнцый, якія адбудуцца перад пачаткам навучальнага году.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб сярэдняй і пачатковай школе паставіла і завастрыла перад усімі асьветнікамі рад адказьнейшых задач. Барацьба з «карэнным недахопам» работы школ—барацьба за якасьць навучаньня. Вакол гэтых задач згрупавана ўвага нарады, увага ўсіх асьветнікаў.

На нарадзе абмяркоўваюцца такія пытаньні: 1) СЫСТЭМА І ЗЬМЕСТ МЭТАДЫЧНАЙ РАБОТЫ (даклад тав. Вальфсона), 2) РАБОТА З МАЛАДЫМ НАСТАЎНІКАМ (даклад тав. Акуліка), 3) ПРАГРАМЫ, ПЛЯНАВАНЬНЕ І ЎЛІК, 4) МЭТАДЫ РАБОТЫ ПА АСОБНЫХ ДЫСЦЫПЛІНАХ, 5) ЯК РЫХТАВАЦЦА НАСТАЎНІКУ ДА ЛЕКЦЫІ і рад іншых.

Работа Ўсебеларускай мэтадычнай нарады сьведчыць, што да пачатку навучальнага году як у НКА, так і ў раёнах яшчэ ня ўсё пад рыхтавана. Ня гледзячы на тое, што ў свой час была мабілізавана значная колькасьць аўтараў і рэдактароў для работы над падручнікамі, што зараз друкарня перайшла на трэцюю зьмену—сваячасовы выпуск падручнікаў з друку не забясьпечан (з 52 вышла толькі 12).

Узорныя школы і інструктары ў раёнах ня ўсюды працуюць узорна. Ня зьвернута належная ўвага на падбор пэдкадраў для ўзорных школ.

Плянаваньне і ўлік у нашых школах зьяўляецца найбольш вузкім месцам. Як адзнача па дакладчыца т. БАРШЧЭЎСКАЯ і выступаўшыя ў спрэчках, у многіх школах пляны складаюцца агульна, няма канкрэтных для данай школы задач і г. д. Няма ўліку пасьпяховасьці вучняў. Нарада выказалася за дыфэрэнцыяваны ўлік пасьпяховасьці вучняў на падставе штодзённага ўліку яго работы.

Б.

Пра рэарганізацыю беларускай дзяржаўнай бібліятэкі ў дзяржаўную бібліятэку і бібліяграфічны інстытут БССР імя У. І. Леніна

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Рэарганізаваць Беларускую дзяржаўную бібліятэку ў Дзяржаўную бібліятэку і Бібліяграфічны Інстытут БССР.

2. Лічыць неабходным урачыстэ адзначыць дзесяцігодзьдзе існаваньня Дзяржаўнай бібліятэкі БССР, якое прыпадаець да 15-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

3. У адзнаку дзесяцігодзьдзя існаваньня Дзяржаўнай бібліятэкі надаць Дзяржаўнай бібліятэцы і Бібліяграфічнаму Інстытуту БССР імя У. І. ЛЕНІНА.

4. Для падрыхтоўкі праведзеньня дзесяцігодзьдзя існаваньня бібліятэкі вызначыць урадавую камісію ў складзе наступных т. т. ПЛАТУНА (старшыня), ГОРЫНА (Беларуская Акадэмія Навук), КЛІМКОВІЧА (ЦСПСБ), РЫЎЛІНА (ЦБ сэкцыі навуковых працаўнікоў), СІМАНОЎСКАГА (дырэктар Дзяржаўнай бібліятэкі).

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР — М. ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР — С. КАНДЫБОВІЧ.



БУДАЎНІЦТВА ПРАКАТНАГА ЦЭХУ МАГНІТАГОРСКАГА ГІГАНТА.

Магчымасьць ёсьць, ды няма... работы

(Ліст калгасьніка)

У сакавіку бягучага году праўленьне калгасу **«На варце» (Крычаўскі раён)** заключыла дагавор з Крычаўскім райкалгасаюзам на пабудову трох сьвінарнікаў. Калгас мае сьвінагадоўчы ўхіл і павінен да канца бягучага году здаць звыш 900 шт. рознай жывёлы.

Згодна дагавору, падрыхтоўка лесаматэрыялаў для пабудовы сьвінарнікаў у калгасе «На варце» павінна была скончыцца **не пазьней 10 мая.** Калгасам для гэтай мэты былі сваячасова закуплены дзьве дзялянкі лесу. Аднак, **да гэтага часу ніводнага бервяна з дзялянак ня вывезена** і будаўніцтва сьвінарнікаў не распачата.

Чаму? Можа ў калгасе не хапіла рабочых або цягавай сілы?

Не. У калгасе «На варце» ёсьць звыш 500 працаздольных калгасьнікаў і 209 рабочых коняй, якія поўнасьцю не выкарыстоўваюцца.

Зрыў пляну будаўніцтва тлумачыцца папершае тым, што гэтай работай зусім ня цікавілася праўленьне калгасу што яно не адчувала адказнасьці за выкананьне дагавору будаўніцтва. А па-другое, — значная доля віны за зрыў пляну кладзецца на крычаўскага тэхніка-будаўніка **Крупадэрова.** Ён толькі адзін раз на ведаў калгас і то абмежаваўся тым, што сказаў загадчыку сьвінагадоўчай фэрмы—«троба будзе пабудаваць сьвінарнік» (?) і на гэтым пастаўіў кропку.

Калгас павінен быў у 1932 годзе прадаць дзяржаве ў парадку цэнтралізаваных загатовак 411 штук сьвіней. За першы і другі кварталы плян гэтых загатовак выканан на 11 проц. І яшчэ горш справа стаіць з укамплектаваньнем сьвінафэрмы. За гэты-ж час па ўкамплектаваньні плян выканан толькі на 1—2 проц.

Нельга абыйсьці моўчкі таксама і таго, што зрыў пляну камплектаваньня ў значнай ступені тлумачыцца тым, што праўленьне калгасу **выкарыстала не па прызначэньні 2.000 руб., якія былі адпушчаны на закупку сьвіней.** Тыя калгасьнікі, што здавалі ў арганізаванае стада свае ўласныя сьвіньні, па паўтода не атрымлівалі за іх пропны.

Цікава, чаму не ўмяшаецца ў гэтую справу Крычаўскі райкалгасаюз, ня прыцягне да адказнасьці вінаватых, не дапаможа калгасьнікам калгасу «На варце» выканаць ускладеныя на іх задачы?

Калгасьнік В. А.

Згуба карэспандэнцый ня трывожыць работнікаў менскай пошты

Ніхто ня зьбіраецца абвяргаць таго, што лістаносец—звычайны чалавек — перасоўваецца па зямлі значна павольней, чым паштовы цягнік. Аднак, не падлягае сумненьню што той жа лістаносец, каб прайсьці ці ад Менскай пошты ў любы канец гораду, затраціць куды менш часу, чым паштовы цягнік на праезд з Масквы ў Менск.

Але-ж няма правіл без выключэньня. На маё імя з Масквы 16 чэрвеня была выслана паштовая картка, з надзвычай важным для мяне паведамленьнем. У Менск гэта карэспандэнцыя прыйшла 18 чэрвеня. Аб гэтым сьведчаць лічбы на штампе Менскай пошты. Атрымаў-ка я гэтую картку толькі 9 ліпеня. Такім чынам на перавоз пошты з Масквы ў Менск затрачваецца два дні, а на перасылку карэспандэнцыі з менскай пошты да кватэры адрэсата—скухара таго-ж гораду—21 дзень.

Становішча яўна ненармальнае.

Аднак, па гэтым справа не канчаецца. Атрымаўшы з такім спазьненьнем ліст, я накіраваўся ў бюро скаргаў, якое знаходзіцца пры цэнтральным паштовым аддзяленьні, з тым, каб атрымаць тлумачэньні, каб выявіць канкрэтнага вінаватага ў затрымцы ліста. Але-ж так, як гэта было ўжо пасьля дзьвюх гадзін дня—бюро не працавала, я прымушан быў зайсьці ў другі раз.

11 ліпеня я зноў зьвярнуўся за дапамогай у бюро скаргаў, дзе атрымаў вельмі вымаразны і лёкапічны адказ:

— Гэта ня наша справа.

Аказваецца, што «гэта справа аддзелу дастаўкі паштовых карэспандэнцый». Іду ту ды. Там мне адказваюць ужо больш «падрабязна»:

— Нічога даўнага няма. Мы і самы ведаем, што нашы лістаносцы яшчэ ня зусім добра працуюць. Гэта па-першае. А па-другое,—мы наогул **простых адпраўленьняў ня ўлічваем.** Так, што зрабіць нічога ня можам...

...Згуба адкрыткі—факт дробны. Аднак, трэба мець на ўвазе, што гэты факт не адзінкавы і апрача таго, што ён ёсьць рэзультат бястурботных, бюракратычных адносін да сваіх абавязкаў з боку работнікаў сувязі, рэзультат **абязьлічні,** што пануе ў апараце пошты.

Нельга дапусьціць таго, каб работнікі пошты не адказвалі за дастаўку самай шматлікай карэспандэнцыі—простых лістоў.

П. Хзіфэц.

Чачэрскаму РВК—ад шаптуноў падзяка...

(Ліст калгасьніка)

Значная частка вёсак **Чачэрскага раёну,** якія мяжуюцца з Веткаўшчынай, знаходзяцца на аддаленасьці 20 і больш клм. ад раённых цэнтраў. З гэтай прычыны ў свой час у адной з гэтых вёсак **(Дудзічы)** была адкрыта амбуляторыя і вэтэрынарны пункт.

Даводзіць аб тэй карысьці, якую мелі ад гэтых устаноў працоўныя сяляне наўкольных вёсак наўрад ці патрэбна. Беднякі і сераднякі з глухога кутка Чачэрскага раёну заўсёды маглі атрымаць патрэбную мэдычную дапамогу і сваячасова папярэдзіць захворваньні або надзёж жывёлы.

Зараз на месцы вёсак, аб якіх ідзе гутарка, арганізавана каля 10 буйных калгасаў, якія, усе без выключэньня, маюць жывёлагадоўчы ўхіл. Не падлягае сумненьню, што пры гэтай умове Дудзіцкі вэтпункт набыў яшчэ большае значэньне.

Аднак, Чачэрскі РВК падышоў да справы інакш. Пасьля таго, як у вёсках, што знаходзяцца вакол Дудзіч і ў саміх Дудзічах арганізаваліся калгасы з вялікай колькасьцю жывёлы, Чачэрскі РВК знайшоў па трэбным перанесьці Дудзіцкі вэтпункт у другое месца, за некалькі дзесяткаў клм., і пакінуць рад калгасных МТФ і СТФ без вэтэрынарнай дапамогі.

Ня лепш справа стаіць і з мэдычным абслугоўваньнем гэтых калгасаў і вёсак. У Дудзіцкай амбуляторыі застаўся толькі адзін фэльчар Язерскі, які наўрад ці мае права казываца мэдыцынскім работнікам. Ня мала ёсьць выпадкаў, калі Язерскі, з-за нядбайных адносін да працы і з прычыны сваёй малой кваліфікацыі не ўстановіць, як належыць, хваробы і дае лякарства наўгад. Такія «мэтады лячэньня» дрэнна адбіваюцца на здароўі наведвальнікаў. Адно, што ўмее рабіць Язерскі, гэта вымагаць ад пацыентаў сабе «на чай».

Усё гэта, як ня трэба лепш, выкарыстоўваюць у сваіх мэтах «бабкі», шаптуны і інш. «экс-мэдыкі» часоў дзікунства. Яны напэўна ад душы дзякуюць Чачэрскаму РВК, які сваімі нядбайнымі адносінамі да Дудзіцкай амбуляторыі і сваім распараджэньнем аб Дудзіцкім вэтпункце стварыў ня дрэнныя ўмовы для іх «практыкі».

П. М-КА.

Упартасьць, якую трэба зламаць

(Ліст працоўных аднаасобнікаў Пухавіцкага раёну)

Картонная фабрыка імя Леніна адабрала ад нас 9,19 дзесяцін сенажаці. Гэтай сенажацьцю карысталася 18 аднаасобных гаспадарак. Мы пісалі некалькі скаргаў Пухавіцкаму РВК, які пакінуў нашы скаргі без задаваленьня.

Нам і да гэтага часу невядома дзе пасіць. РВК, нарэшце, параіў даць нам у замену сенажаць, якая знаходзіцца ад нас за 10 клм., пры чым частка гэтай сенажаці ўжо скошана.

Мы падавалі скаргу ў Наркамзем БССР, які даў распараджэньне Пухавіцкаму РВК каб нам вярнулі адняту сенажаць. Але пухавіцкія раённыя бюракраты да гэтага часу марыгуюць распараджэньне Наркамзему.

Дырэктар фабрыкі Сярмяжка па-нянавадельску адносіцца да ўказаньня Наркамзему. Ён пагражае нам арыштам. Калі мы скасьлі 2 дзесяціны сенажаці, дык дырэктар ня даў нам убраць скошанага сена.

Упаўнаважаныя ад 18 гаспадарак:
Строчын, Іваноў.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» чакае ад Пухавіцкай райКК-РСІ паведамленьня па гэтаму лісту.

Сідарэвіч—кулацкі служка

(Ліст калгасьніка)

Вясною гэтага году старшыня калгасу «МУРАВЕЙ» СІДАРЭВІЧ Янка павёў сярод калгасьнікаў агітацыю за выхад з калгасу. Раду калгасьнікаў Сідарэвіч напісаў заявы аб выхадзе. Пад выглядам звароту раней аграмаджанай маемасьці Сідарэвіч выдаваў вышаўшым з калгасу калгасны інвэнтар і лепшую калгасную жывёлу. З мэтай разбурыць калгас, Сідарэвіч стаў выкідваць з калгасу бяднейшую частку вёскі. Так, адхілен быў ад усіх спраў і выжыт з калгасу бядняк, член праўленьня Квяцінскі. Зьнята з работы па догляду жывёлы бяднячка Шатыра, а гэта работа даручана жонцы Сідарэвіча.

Грашовыя справы ў калгасе не вяліся. Выручка ня прыходавалася.

Калгасныя сродкі выкарыстоўваліся Сідарэвічам для сваіх уласных патрэб.

АБ ШКОДНІЦКІХ ДЗЕЯНЬНЯХ СІДАРЭВІЧА Я ДАВОДЗІЎ ДА ВЕДАМА СТАРШЫНІ СЕЛЬСАВЕТУ СЬЦЯПАНАВА, але сельсавет ня ўжыў ніякіх захадаў.

Зараз у калгасе засталося 5 гаспадарак. Калгасная маемасьць разбазараецца Сідарэвічам і яго сваякамі.

Неабходны тэрміновыя меры, каб не дапусьціць развалу калгасу.

ПЯРЭДНЯ.

Вынікі самацёчных настрояў

Падрыхтоўка да новага навучальнага году па **Аршанскім раёне** праходзіць вельмі марудна. З-за незабясьпечанасьці будаўнічымі матэрыяламі ў радзе школ (Баранская ФЗС, Галцэўская ШКМ, 6-я расійская ФЗС) зрываецца рамонт. Па высяленьні са школьных будынкаў прыватных асоб і устаноў нічога ня робіцца. Ёсьць выпадкі зусім адваротнага парадку. Напрыклад, старшыня РКК-РСІ катэгарычна забараніў загадчыку расійскай школы г. Воршы высяляць прыватных асоб са школьнага будынку і прыгразіў, што «калі высяліш, дык адбяру партбілет і пасадку ў спраўдом».

Пытаньне аб забясьпячэньні школ гарачымі сьнеданьнямі, апалам, абстаяваньнем толькі зьбіраюцца ставіць у гарсавеце.

РК КП(б)Б і РВК павінны тэрміново і пабаявому ўзяцца за падрыхтоўку да новага навучальнага году і дабіцца ў гэтай рабоце рэзкага пералому.

С. Кармазынаў.

бу ў пазыцыі заможнага сялянства, часткі серадняцтва і гарадзкой дробнай буржуазіі ў рэвалюцыі. Адсюль, напрыклад, выхад «Прарок» Купалы, аб якім мы ўжо гаварылі вышэй, а таксама вядомая ўсім яго п'еса «Тутэйшыя», дзе буржуазны нацыяналізм даходзіць да крайніх разьмераў.

* * *

Годы жорсткай барацьбы—1918—20, якія патрабавалі так многа гераізму і аддапасьці з боку рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас Беларусі, нарэшце скончыліся перамогай. БССР стала гістарычным фактам. У гэтай барацьбе працоўных мас за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне быў **толькі адзіны кіраўнік і правадыр—камуністычная партыя бальшавікоў.** Пад яе пазьменным кіраўніцтвам рабочасялянская Беларусь вызвалілася ад векавога прагнёбу нейкай «безназоўнай», авеянай вялікадзяржаўнай пагардай, або нацыяналістычна-містычнай рамантыкай—краіны, увайшоўшы ў вялікую брацкую сям'ю народаў Савецкага саюзу.

Вялічыні гэтага гістарычнага факту нельга недаацэньваць, калі мець на ўвазе хаця-б той сумны вобраз «сонпнага краю», які доўгія гады пазнаваў у старой беларускай літаратуры. Як нейкая нячуваная рэвалюцыйная эпапэя, гэта тэма (ператварэньня Беларусі ў Сацыялістычную Беларускую Рэспубліку) яшчэ чакае свайго аўтара з радоў нашай савецкай літаратуры.

Мы закранулі гэтыя пытаньні для таго, каб больш ясна ўявіць сабе тое, як маглі адгукнуцца і адгукнуліся на вялікія гістарычныя зьмены лепшыя з прадстаўнікоў беларускай літаратуры. Да іх мы дадаўдзем Янку Купалу, паказваючы адначасова і горшыя бакі яго вазэі.

Барацьба рабочых і сялян Беларусі эпохі 1918—20 гг. не прайшла бясьсьледна для Янкі Купалы. Калі ён не разумоў інтэрнацыяналізму і канчатковых мэт гэтай барацьбы, дык усё-ж ён ня мог ня бачыць, што няма ніякага другога «народу», які-б мог зьдзейсьніць нацыянальныя ідэалы паэты, адбудаваць «вольную бацькоўшчыну». Ленін за ўсё вылівіўся гэты настрой Купалы ў вершы «Шляхам гадоў» (1923 год), у якім паэта прабуе падвесьці вынікі чэрвеньковаму жыцьцю. Верш канчаецца бадзёрэмі аптымістычнымі радкамі:

«Дык-жа шумі, красуй у волі, родны край!
Зьвіні ў свой зоп, сялянска-пралетарскі звон!
Сьпявай ты, Беларусь, у радасьці сьпяшай!
Твайго народу сёньня права і закон».
(т. VI, стар. 165).

Тут яшчэ старыя Купалавы словы, але пры ўсім тым, гэта значны крок наперад у параўнаньні з «Паняжданамі», або нават «Безназоўным». У савецкі пэрыяд творчасьці Янка Купала напісаў нямнога і, скажам адкрыта, напісанае ім—ня ёсьць лепшае ў яго «спадчыне». Паэта даў некалькі сваіх водгукаў на рэвалюцыйна-грамадзкія падзеі з жыцьця Савецкай Беларусі, у якіх мы знаходзім характэрныя думкі і пачуцьці для Купалы—народнага паэты. Да такіх твораў мы адносім «Дыктатура працы», «Зыходзіш вёска з яснай явы», «Летапісное», «Піянэрскае» і інш.

Ня будзем скарджацца на паэту за тое, што нават у сваіх вершах ён гаворыць старымі словамі, а часам і думкамі: мы зараз ведаем, чаму не магло быць і ня было ў яго поўнага і яснага разуменьня савецкай рэчаіснасьці. Заслугоўваюць увагі ў гэтых вершах настроі, якія Купала выявіў у наступных словах, прысьвечаных 10-годзьдзю БССР:

Заруненець пацеткі
Руньню буйнай, сачыстай,
Людзі працу ўшануюць
Бясспрыгонна, ўрачыста.
Нацыянальная сварка
Ужо ў нас месца ня знойдзе, —
Чалавек чалавеку
Будзе братам по праўдзе...»
(т. VI, стар. 183).

Ня гледзячы на народніцкі гуманізм гэтых радкоў, тут мы наглядаем нейкую важную зьмену ў духоўным абліччы паэты. Бязумоўна, ён па-свойму ўяўляе сутнасьць дыктатуры працы, бачачы яе, так сказаць, «жалезны бок», а ня ўсю шматгранную сут пасьць. Таксама нявясна разумее паэт новыя зрухі, якія ўнесла калектывізацыя, тэй жорсткай клясавай барацьбы, якая суправаджала калектывізацыю. Але важна тое, што Купала, паэт «нядолі мужыка», разумеў, што мінулае — той стары, «нескаданы сон» для новай вёскі бясьсьледна зтінуў, а з ім і старыя песьні пра «долю-няволю»:

«Твайх жалёек сьпеў гаротны
Патопча трактарнае кола
А сейбіт твой дасьць самотны
Абшэрны сонцам воблік потны
Пад крыж ня пойдзе спчыць вола».
(т. VI, стар. 159).

І, зразумела, для нас здаюцца архаічнымі словы аб «вернаподданным народзе», які ўжывае тут Купала, малюючы вобразы новай вёскі. Да змагароў за сацыялістычную калгасную вёску, якіх налічваюцца мільёны, гэтыя словы яўна не падыходзяць. Вось на гэтым пункце ўспрыняцьця нашай савецкай рэчаіснасьці спыніўся і зараз знаходзіцца Янка Купала. У нас могуць спытацца: чаму так шмат увагі мы аддалі аналізу дарэвалюцыйнай творчасьці Янкі Купалы? Таму, што іменна ў мінулым, яго ўмовах, ляжаць, як арыгінальнасьць Купалы, так і яго ранейшыя і цяперашнія памылкі і слабасьці. Зразумець іх, гэта значыць зразумець характар асноўнай плыні беларускай нашаніўскай літаратуры.

Каб рэзюмаваць нашы думкі і выказваньні аб творчасьці Янкі Купалы, зробім кароткія вывады:

1. Пралетарыят і камуністычная партыя, ствараючы новую беларускую культуру, сацыялістычную па зьмесьце і нацыянальную па форме, бярэ са старой нацыянальнай культуры **«толькі** яе сацыялістычныя, яе дэмакратычныя элемэнты» (Ленін). Гэта значыць, што са старой беларускай літаратуры паогул і з твораў Купалы ў прыватнасьці, пралетарыят бярэ не «нашаніўства» паогул, а **толькі** сапраўды дэмакратычную і рэвалюцыйную частку гэтай спадчыны; усё тое, у чым зусім рэальна адбілася гістарычная барацьба асноўных сялянскіх мас. Вось чаму мы бярэм «Жалейку» і «Гусьляра» і адмаўляемся ад «Сну на кургане», або «Прарока» Янкі Купалы, адмаўляемся ад варожых, чужых нацыянал-дэмакратычных думак у творах Купалы, якія ўсбройваюць нашых клясавых ворагаў і налёўнасьць якіх прызнаў сам паэта пры дапамозе марксыцкай крытыкі.

2. Вялікадзяржаўныя шавіністы, з аднаго боку, і беларускія нацыянал-дэмакраты —прабавалі (і прабуюць), або цалкам адмаўляць паэзію і заслугі Янкі Купалы, або цалкам апалёгезуюць усю яго творчасьць аж да містыкі ўпадніцтва і нацыяналізму. З тымі і другімі мы вялі і будзем весьці самую непрымірымую, самую бязьлітасную барацьбу. Ні ілжывая «лявізна» адных, ні народніцка-лібэральная дэмагогія другіх не дапаможа ім захаваць свой твар ворагаў пралетарыяту, працоўных Беларусі якія ствараюць сацыялістычна-нацыянальную культуру.

3. Нашай маладой савецкай беларускай літаратуры няма патрэбы ні ігнараваць, ні баяцца старой літаратурнай спадчыны. Наадварот, трэба яшчэ больш вывучаць і, галоўнае, ісьці «ўперад і вышэй», вось такімі гіганцкімі крокамі, якія ўжо зрабіла і мае зрабіць БССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі. Той росквіт культуры і літаратуры на Беларусі, які мы маем на сёньнішні дзень, ёсьць зарука таму, што хутка будзем мець мы яшчэ больш яркія дасягненьні, вартыя вялікага сацыялістычнага будаўніцтва. Пастанова ЦК УсеКП(б) аб стварэньні адзінага саюзу савецкіх пісьменьнікаў зьяўляецца новым магутным штуршком для росквіту ў нас мастацкай літаратурнай творчасьці.

4. Розным сэкулянтам ад «народніцтва» і лібэралізму ў адносінах да старой беларускай літаратуры мы паномнім глыбокія, яркія і поўныя паэтычнага натхненьня наступныя словы аб крыродзе «народніцкіх мараў», у якіх дана адначасова і характарыстыка мастацтва пралетарыяту.

«Лятуценнасьць гэтага роду,—пісаў Уладзімер Ільіч у 1905 годзе,—уласьцівая і расійскаму селяніну, і расійскаму інтэлігенту, ёсьць дробна-буржуазная лятуценнасьць. Кветкі гэтай народніцкай лятуценнасьці—іменна тыя **фальшывыя кветкі, якія ўпрыгожваюць адзін з ланцугоў працоўнага чалавецтва і сацыял-дэмакратычная крытыка павінна бязьлітасна** зрываць такія кветкі не для таго, каб чалавецтва працягвала насіць у іх форме, пазбаўленай усякай **радасьці і ўсяжага «наслаждения»,** а для таго, каб яно **скідала ланцугі і працягнула руку за жывой кветкай»** (т. VII, стар. 214—215. Падкрэслена мною.—**Р. К.**).

Праграма ўраду фон-Папэна

Увядзеньне абавязковай працоўнай павіннасьці

БЭРЛІН. Германскі ўрад распрацоўвае шырокую гаспадарчую заканадаўчую праграму, якую ён мае намер прадставіць рэйхстагу. Чакаюць, што гэта праграма будзе апублікавана ў апошні тыдзень перад адкрыцьцём рэйхстагу. Праект гэтай праграмы будзе абмяркоўвацца гэтымі днямі ўрадам. Праект прадугледжвае зьмену заканадаўства, рад зьмен у форме кіраўніцтва дзяржаваю, а таксама рэформы выбарчага права, аб якой ужо гаварылі ў сваіх прамовах, як Гайль, так і фон-Папэн.

Гаспадарчая праграма, якую мае намер правесьці ўрад, прадугледжвае ў першую чаргу **правядзеньне абавязковай працоўнай павіннасьці, рэарганізацыі сыстэмы выдачы дапамогі беспрацоўным, зьмену тарыфнай палітыкі, прадастаўленьне работы беспрацоўным і пытаньне аб «ажыўленьні гаспадаркі шляхам разьмеркаваньня заказаў».** Як паведамляе «Дэр Монтаг» урад натыкаецца ў правядзеньні сваіх эканамічных плянаў на нежаданьне рэйхсбанку фінансаваць урадавыя планы. «Цяпер-жа піша «Дэр Монтаг», урад ня бачыць другога выхаду, як прымусіць рэйхсбанк пайсьці насустрач патрабаваньням ураду».

Гітлер адцягвае прыняцьце рашэньня

БЭРЛІН. Прэса перадае, што ў гутарцы з Гіндэнбургам Гітлер даслоўна патрабаваў для сябе такога-ж становішча, якое Мусаліні заняў у Італіі пасьля паходу на Рым. У дадатак да ўчарайшага паведамленьня аб абавязацельстве Гітлера падтрымліваць урад Папэна, сёньня афіцыяльна паведамляецца, што гэта абавязацельства было дано ня толькі Гітлерам, але і радам адказных кіраўнікоў нацыянал-сацыялістаў, прычым падтрыманьне было абяцана ня на кароткі тэрмін, а на ўвесь час існаваньня «прэзыдэнцкага» габінэту.

Назначаная на 16 жніўня канфэрэнцыя нацыянал-сацыялістычных дэпутатаў рэйхстагу і ляндтагу адтэрмінавана на неакрэсьлены час. Па думцы правых газэт, гэтае адтэрмінаваньне азначае, што Гітлер жадае прыняць рашэньне адносна далейшай тактыкі сярод вузкага кола партыйнай верхавінкі, ня прыцягваючы да гэтага больш шырокай групы некалькіх соцень фашысцкіх «улцер-афіцэраў», якім будуць потым паведамлены канчатковыя пастановы кіраўніцтва.

Паводле думкі «Дэйчэ Альгемэйнэ Цэйтунг» Гітлер, высунуўшы ў сваёй суботняй гутарцы з Гіндэнбургам максымальныя патрабаваньні, тым самым выратаваў звонку адзінства партыі. Аднак, рад фактаў сьведчаць, што анаэзыцыйныя настроі сярод штурмавых атрадаў пасьля няўдачных перагавораў яшчэ больш узмацніліся. У суботу ноччу ў Бэрліне адбывалася нарада камандзіраў бэрлінскіх штурмовых атрадаў, на якой амаль што ўсе прысутныя высоўвалі патрабаваньне безадкладна выступіць на вуліцу. Усе ўказаньні, што «гаспадарчыя колы» рашуча супроць такога выступленьня, зрабілі ўплыў на прысутных, якія і пастанавілі чакаць пастановы свайго цэнтру. Узброены лягер у Обэр-Барнім учора быў распушчаны цэнтрам за парушэньне дысцыпліны.

Сёньня «Ангрыф» друкуе перадавы артыкул Гебэльса, які, паўтарыўшы патрабаваньні нацыянал-сацыялістаў, канчае: «са спакойнай і ўпэўненай рашучасьцю наш рух ідзе ўперад». Яго мэта застаецца нязьменнай: «улада Гітлеру». «Дэйчэ Альгемэйнэ Цэйтунг» прадракае, што ў выпадку, калі ў верасьні парляманцкі крызіс будзе разьвівацца далей, дык Гіндэнбург назначыць выбары ў нацыянальны збор.

Канчатковае разьмеркаваньне мандатаў у новым рэйхстагу

БЭРЛІН, 17. Апублікаваны канчатковыя афіцыяльныя даныя аб разьмеркаваньні мандатаў у новым рэйхстагу. Паводле гэтых даных з 608 мандатаў **кампартыя атрымала 89 мандатаў**, сацыял-дэмакраты — **133** мандаты, нацыянал-сацыялісты — **230** мандатаў, партыя цэнтру — **75**, нацыяналісты — **37**, германская народная партыя — **7**, ляндфольк — **1**, баварская народная партыя — **22**, гаспадарчая партыя — **2**, дзяржаўная партыя — **4**, хрысьціянска-сацыялістычная партыя — **4** мандаты, германская сялянская партыя — **2** мандаты, вюртэмбэрская сялянская партыя (ляндбунд) — **2** мандаты.

СССР І КАПІТАЛІСТЫЧНЫ СЬВЕТ

Японская прэса задаволена падпісаньнем згоды

ТОКІЕ, 15. Усе газэты на відным месцы публікуюць паведамленьне ТАСС аб падпісаньні згоды па рыбалоўным пытаньні і выказваюць задаваленьне наконт гэтага. Усе газэты знаходзяць, што згода адхіляе недахопы канвэнцыі.

Газэта **«Асахі»**, камэнтуючы пытаньне аб заключэньні згоды, падае гістарычны агляд японска-савецкіх адносін па рыбалоўным пытаньні. Газэта «Ніці-Ніці» паказвае, што згода адхіляе «супярэчлівыя тлумачэньні канвэнцыі і такім чынам практычна вырашае ўсе непаразуменьні паміж СССР і Японіяй па рыбалоўным пытаньні». «Таму, — піша газэта, — ня гледзячы на часовы характар, згода мае вялікае значэньне». Газэта «Хоці» таксама лічыць, што згода «пакінула з непаразуменьнямі ў паўднёвых водах». Газэта **«Іоміўры»** называе згоду «стабілізацыяй рыбалоўства ў паўднёвых водах выгоднай для абодвух бакоў».

Старшыня таварыства рыбапрамыслоўцаў «Роўыё Суйсан Куміай» Кабаяма ў інтарвію заявіў, што ён вітае заключэньне згоды, якое азначае прыяцельскае вырашэньне японска-савецкай спрэчкі па рыбалоўным пытаньні.

Прыезд віцэ-прэзыдэнта расійска-брытанскай гандлёвай палаты

У Маскву прыбыў віцэ-прэзыдэнт Расійска-Брытанскай гандлёвай палаты ў Лёндане і член прэзыдыуму Ўсесаюзнай гандлёвай палаты п. **Меткаф.** З прычыны яго прыезду Ўсесаюзная гандлёвая палата наладзіла прыём, на якім прысутнічалі савецкія гаспадарнікі, прадстаўнікі наркаматаў, адказныя супрацоўнікі палаты, а таксама камэрцыйны дарадца брытанскага пасольства п. Пэйтэн, дырэктар буйнага ангельскага авіяцыйнага заводу п. Хэкет і інш.

Ад імя Ўсесаюзнай гандлёвай палаты госьця вітаў генэральны сакратар палаты тав. **Макавецкая.**

У адказным слове **п. Меткаф** указаў, што цяперашні яго прыезд мае на мэце садзейнічаць устанаўленьню больш ажыўленых гандлёвых зносін паміж СССР і Вялікабрытаніяй.

Спыняючыся потым па дзейнасьці Расійска-Брытанскай гандлёвай палаты ў Лёндане, п. Меткаф указвае, што пэўны час пасьля разрыву зносін паміж СССР і Англіяй у маі 1927 г. дзейнасьць палаты была параліжавана. Але за апошнія гады палата зноў стала моцнай і актыўнай арганізацыяй, аб'ядноўваючай звыш 200 буйных брытанскіх прамысловых і імпартных фірм.

У Вялікабрытаніі зараз існуюць два пункты гледжаньня на ангельска-савецкі гандаль: з аднаго боку, ёсьць імкненьне спыніць імпарт савецкіх тавараў у Вялікабрытанію ў карысьць брытанскіх калёній; з другога боку, прымаецца пад увагу немагчымасьць адрыву Вялікабрытаніі ад сусьветных рынкаў, асабліва ад рынку СССР з яго ўзрастаючым уплывам на вялікія часьці азіяцкага кантынэнту.

Ангельскія гандлёвыя колы ўлічваюць тыя абставіны, што СССР зьяўляецца зараз адзінай крыніцай, якая ня толькі не скарачае, але нават пашырае свае заказы. Аднак, для пашырэньня гандлю неабходна наяўнасьць гандлёвага дагавору і гэта зьяўляецца задачай абодвух бакоў, у прыватнасьці, абедзьвюх палат. Можна меркаваць, што пры больш шырокім крэдытаваньні ангельскага экспарту ў СССР ангельцы вярнуліся-б у гандлі СССР з Вялікабрытаніяй да становішча, якое існавала да 1927 году. Правільнае прадстаўленьне аб гэтым на Атаўскай канфэрэнцыі бязумоўна мела вялікае значэньне.

Тав. Мэнд (Наркамвод) падкрэсьліў, што савецкія закупкі ў Англіі, у прыватнасьці, суднаў і абсталяваньня для іх, былі-б значна большымі, калі-б пытаньне аб крэдытах было вырашана больш спрыяюча. Аднак, што ня зроблена ўчора, тое можа быць зроблена сёньня і заўтра, — гаворыць тав Мэнд, — і можна спадзявацца, што пытаньне аб савецкіх закупках у Англіі будзе ўрэгуляванэ ў інтарэсах абедзьвюх краін.

Таварыства садзейнасьці савецка-фінляндзкаму гандлю

ГЕЛЬСІНГФОРС. У Выбаргу адбыўся ўстаноўчы сход акцыянэрнага таварыства для садзейнасьці тавараабмену паміж Фінляндыяй і СССР, які панава ствараецца. Сход, які адбываўся пад старшынствам кіраўніка сельска-гаспадарчага аб'яднаньня Выбаргскай губерні Пульлінена, выбраў праўленьне таварыства. Афіцыёз «Суоменмаа» паведамляе, што дзейнасьць таварыства будзе заключацца ў садзейнасьці гандлю сельска-гаспадарчымі прадуктамі.

ПАВОДКА Ў МАНЧЖУРЫІ—НЯБЫВАЛАЯ КАТАСТРОФА

120 тысяч чалавек--пад адкрытым небам.--Эпідэмія халеры у Харбіне

БЭЙПІН. Як паведамляюць з Харбіну, у вытоках ракі Сунгары вада кінула прыбываць і паказвае на пачатак спаду. На рацэ Нонні таксама адзначана зьмяншэньне вады. Пад'ём вады ў Харбіне — нязначны. Чакаецца пералом.

Фудзядзянь (прыгарад Харбіну), а таксама ніжняя часьць Харбіну, уключаючы галоўныя вуліцы гораду, пакрыты вадой. Паводле падлікаў прэсы, у выніку паводкі **звыш 120 тыс. бежанцаў, галоўным чынам, кітайцаў, пазбаўлены харчоў і жылля** і знаходзяцца пад адкрытым небам. Каля 15 тысяч бежанцаў размешчаны ў школе, друкарні і будынках КУЧ.

Пры савецкім генэральным консульстве ў Харбіне арганізавана камісія дапамогі пацярпеўшым. Пачаўся збор сродкаў сярод савецкіх грамадзян. Учора **савецкі генэральны консул у Харбіне тав. Славуцкі перадаў Чжан Цзін-гую 5.000 харбінскіх даляраў для аказаньня дапамогі пацярпеўшым.** Савецкая калёнія забясьпечвае харчаваньне пацярпеўшым савецкім грамадзянам. У барэках КУЧ размешчана ня менш 3.000 кітайскіх бежанцаў.

Паводле паведамленьняў харбінскіх газэт, **сярод бежанцаў выбухнула эпідэмія халеры.** Пачынаючы з 7 жніўня, ў Харбіне зарэгістравана 114 выпадкаў захворваньня на халеру, з іх 25 з смяротным вынікам. У бліжэйшай вёсцы каля Харбіну за гэты час памёрлі ад халеры 21 чал.

Паведамляюць, што ў Гірыне вялікая паводка.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Шырыцца фронт савецкага вынаходзтва

Новая малатарня

Усесаюзны інстытут с.-г. гаспадарчага машынабудаўніцтва распрацаваў малатарню сыстэмы вынаходцы Краснова. У гэтай малатарні мэханізавана ўсё, пачынаючы з падачы збожжа ў снапох і канчаючы выкіданьнем саломы. Асабліваясьць малатарні—простасьць пабудовы пры вялікай складанасьці апэрацый, што ёю выконваюцца. Каля 40 проц. дэталяй малатарні Краснова робяцца з дрэва ў той час, як амэрыканская малатарня «Адванс Румлі» цалкам робяцца з мэталю. Пры масавым вырабе малатарань Краснова эканомія ў матар'ялах складзе 2—3 млн. руб. па тысячу машын.

Цэмант са шлакаў

РАСТОЎ-ДОН. На Сулінскім заводзе скончана будаўніцтва ўстаноўкі па грануляцыі доменных шлакаў для цэмэнтнай прамысловасьці. Гануляваныя шлакі, размолатыя і злучаныя з клінкерам (15-20 проц.), даюць шлакапортляндцэмэнт, які ня ўступае па якасьці стандартнаму портляндцэмэнту.

Новы спосаб выганкі смалы

Рабочы менскага хэмфармзаводу тав. Эйдэльман вынайшоў спосаб выганкі смалы пры дапамозе пары. Спосаб тав. Эйдэльмана дае магчымасьць атрымаць, апрача шкіпінару і экспартнае каніфольнае мыла. Рэшткі смаляных карчоў — шчапа — будуць выкарыстоўвацца для выпрацоўкі паперы. Вопыты ўсё скончаны. Зараз распрацоўваецца канчатковы праект ўстаноўкі і апэрацыйны плян рэалізацыі вынаходніцтва. Дакладная ўстаноўка, па сутнасьці, зробіць тэхнічны пераварот у смалакурэньні.

Хроніка сацыялістычнай будоўлі

Унівэрсальны прыбор для расточкі шатунных падшыпнікаў для трактараў і аўтамашын вынайшоў тэхнікум-пэктар Трактарацэнтру **т. Сабалеўскі.** Прыбор вызваляе народную гаспадарку ад замежнага імпарту. Белсельгасснабу даручана прыступіць да масавага вырабу прыбораў.

Тав. Палаўгузня—тэхнік гуты «Камінтэрн» скансструяваў машыну для выпрацоўкі дрыўляннага пылу. Пыл павінен замяніць жытнюю муку, якая да гэтага часу ўжывалася для абсыпкі форм пры выдуваньні бутэлек. Гэта вынаходзтва дае эканоміі 12 тон мукі ў год на анцэй толькі гуце.

Плян трэцяга кварталу па мабілізацыі сродкаў выканан толькі на 28,4 проц.

Выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў трэцяга кварталу

(Па 10 жніўня ў проц. да заданьня)

Ідуць упярэдзе

1. Заслаўскі раён	73,9	8. Полацкі	38,8
2. Сіроцінскі	52,2	9. Тураўскі	33,5
3. Мсьціслаўскі	49,2	10. Старобінскі	37,1
4. Жыткавіцкі	43,8	11. Віцебскі	36,7
5. Менскі	48,1	12. Мазырскі	36,7
6. Любаньскі	44,1	13. Аршанскі	36,4
7. Гомельскі	40,0		

Цягнуцца ў хвасьце

1. Барысаўскі	19,9	15. Касьцюковіцкі	15,6
2. Чырвонапольскі	19,9	16. Веткаўскі	15,4
3. Сураскі	19,7	17. Гарадоцкі	14,8
4. Чэрвеньскі	19,4	18. Бялыніцкі	14,8
5. Слуцкі	19,2	19. Чавускі	14,6
6. Глускі	18,8	20. Церахаўскі	14,0
7. Горацкі	18,2	21. Бягомльскі	12,1
8. Рагачоўскі	18,2	22. Кармянскі	12,1
9. Асьвейскі	17,9	23. Клічаўскі	11,9
10. Хойніцкі	17,5	24. Бярэзінскі	11,8
11. Чэрыкаўскі	17,1	25. Старадарожскі	10,4
12. Чачэрскі	16,6	РАЗАМ ПА БССР:	23,4
13. Пухавіцкі	16,2		
14. Лоеўскі	16,2		

УВАГА. Астатнія раёны займаюць сярэдняе месца.

Плян мабілізацыі сродкаў 3-га кварталу на 10 жніўня па БССР выканан толькі на 23,4 проц. Тэмпы работы не забясьпечваюць поўнага ажыцьцяўленьня заданьня. Асабліва дрэнна ідзе мабілізацыя сродкаў у Касьцюковіцкім, Крычаўскім, Гарадоцкім, Бялыніцкім, Чавускім, Церахаўскім, Бягомльскім, Кармянскім, Веткаўскім, Бярэзінскім, Стара-Дарожскім раёнах.

Тлумачыцца гэта перш за ўсё слабасьцю работы фінансава-крэдытнага апарату і ўсіх раённых арганізацый. Раёны, якія змаглі ўзьняць на належную вышыню работу па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў, дабіліся станоўчых вынікаў. Так, Заслаўскі раён свой плян выканаў на 73,9 проц., Сіроцінскі — на 52,2 проц. Здавальняюча выканалі свае пляны таксама раёны: Мсьціслаўскі, Жыткавіцкі, Менскі, Любаньскі, Гомельскі.

Тэрмін, які застаецца да канца кварталу, трэба максымальна скарыстаць, каб поўнасьцю выканаць плян мабілізацыі сродкаў.

Вопыт полацкага Аўтадору—ва ўсе раёны!

Полацкая аўтадорарўская арганізацыя — адна з лепшых у БССР. У 1931 годзе яна дала суботнікамі 5.000 чалавека-дзён па дарожнае будаўніцтва, перавыканала на 10. тыс. руб. шэффонд на матарызацыю пагранвойск АДПУ, павялічыла свае рады на 3.000 новых членаў. За актыўную работу па дарожным будаўніцтве райсавет Аўтадору быў прэміраваны легкавым аўтамабілем. Прэміраваны былі і 8 чалавек аўтадораўцаў, як актыўнейшыя барацьбіты за добрую дарогу.

На вопыце работы 1931 году полацкі Аўтадор з яшчэ большым посьпехам ажыцьцяўляе абавязаньні, узятыя ім на 1932 г. За першую палову гэтага году аўтадораўскія суботнікі далі 7.283 працадні па дарогі дзяржаўнага і мясцовага значэньня, што складае 72,89 гадавога абавязацельства. Пабудавана дарога ў 2 клм. Полацкія аўтадораўцы разам з дарожнай інспэкцыяй свайго раёну пачалі пабудову 1 клм. брукаванай дарогі. Зараз ужо скончаны падрыхтоўчыя зямельныя работы і падвезена 300 кбм. каменьня. Заданьне ЦС Аўтадору па зборы 5.000 руб. шэффонду пагранвойск выканана з перавышэньнем на 1.356 рублёў.

Вопыт сваёй работы полацкі раённы савет Аўтадору пераняў і перанесьці ў іншыя раёны. З гэтай мэтай быў паладжан 13-дзённы аўтамотапрабег па БССР.

Падрыхтоўка да аўтамотапрабегу ў Полацкім раёне выклікала масавую арганізацыю суботнікаў. З 5 па 15 ліпеня — дзяды падрыхтоўкі да старту на дарогі было дана суботнікамі звыш 5.000 чалавека-дзён. Разам з суботнікамі праводзілася самазаманальнае пранцуксёны на дарожным будаўніцтве. Арганізоўвалася шэфства аўтадораўскіх калектываў над дарогаю. Сельсаветы і калгасы бралі рад абавязацельстваў па рамонце непраезджых мясцовых дарог.

Камандаю выбірала цэнтр стаянік для паходнай друкарні, сама разьбігалася на 4 - 5 брыгад і пры дапамозе сельпартячэек, камсамольцаў, членаў сельсаветаў, ударнікаў-калгаснікаў, рабочых і аўтадораўцаў разгортвала работу адразу ў некалькіх пунктах. Работы праводзілася непасрэдна ў полі, у брыгадах калгасаў, дзе папулярызавалі пастановы партыі і ўраду аб калгасным гандлі, аб с.-г. падатку, пастанову ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб уборцы ўраджаю 1932 году, пастановы НКЗ і Калгасцэнтру СССР і БССР аб разьмеркаваньні ўраджаю, аб уборцы сена і г. д. Там-жа праводзілі гутаркі аб пазыцы. Брыгады правяралі таксама ход і якасьць работ на дарожным будаўніцтве, праводзілі гутаркі з рабочымі, знаёміліся з умовамі іх жыцьця і па месцы даб'валіся вырашэньня ўсіх непаладкаў.

У лугтасе «Палата», Полацкага раёну, зацягвалася сенаўборка, зрывалася падніска іх пазыку. На гэтых двох пытаньнях брыгада зрабіла ўвесь упор за час знаходжаньня ў лугтасе. На парадзе трыкутніка лугтасу з удзелам 105 чалавек актыву былі выяўлены прычыны адставаньня. У выніку ўжытых практычных мерапрыемстваў сенаўборка і рэалізацыя пазыкі разгарнуліся з вялікім посьпехам.

У адзнаку аўтапрабегу праведзен рад суботнікаў на дарогах. Расонскі, Асьвейскі, Вушацкі і Бягомльскі раёны абавязаліся даць дарогам 15.000 чалавека-дзён суботнікамі.

За 13 дзён камандай аўтапрабегу абслужана 36 сельсаветаў і 59 калгасаў, праведзена 8 сходаў партыйна-прафэсыянальных, камсамольскіх і аўтадораўскіх арганізацый у раёнах, два пасяджэньні райштабаў па дарбудаўніцтве, 4 масавыя сходы і некалькі дзесяткаў гутарак у калгасах. Рэалізавана па 3.500 рублёў пазыкі, арганізавана 51 ячэйка Аўтадору і інш.

Ва ўсёй гэтай рабоце выключную ролю адыгрывала газэта «Чырвоная Полачына ў аўтамотапрабегу па БССР», якая выпускалася праз дзень вызнной рэдакцыяй раённай газэты.

У Лепельскім і Бягомльскім раёнах пецярпіма зацягваліся работы на 3-м маршруце. У сувязі з гэтым, брыгада паходнай газэты на пленуме лепельскага райвыканкому выпусьціла штурмавую пасьценку. Сабраўшы матар'ял абодвух раёнаў, рэдакцыя ўвесь пяты нумар газэты прысьвяціла характарыстыцы работ і высьвятленьню прычын адставаньня на 3-м маршруце.

За ганебнае адставаньне Плешчаніцкага раёну ў дарожным будаўніцтве, гадавы плян якога выкананы толькі на 20 проц., газэта аўтапрабегу перадала РВК...«ордэн чарапахі». Апрача таго, па ініцыятыве каманды быў праведзен сход плешчаніцкага актыву па пытаньні аб дарожным будаўніцтве. На сходзе падрабязна былі выяўлены прычыны, якія прывялі раён да прарыву і вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы, якія павінны былі забясьпечыць ліквідацыю адставаньня.

Сёньня яшчэ нельга падвесьці поўныя вынікі аўтамотапрабегу па БССР. Аднак, станоўчае значэньне яго ўжо відавочна. Перны вопыт і ініцыятыва полацкай аўтадораўскай арганізацыі заслугоўвае ўвагі.

Трыкутнік Галоўдартрансу БССР зьвярнуўся са спэцыяльным лістом да полацкага Аўтадору, у якім адзначае вялікую ролю праведзенага аўтапрабегу як для падвышэньня дарожняга будаўніцтва, так і для папулярызацыі важнейшых пастаноў партыі і ўраду. Трыкутнік раіць усім партарганізацыям сьледаваць прыкладу полацкага Аўтадору.

С. Анціпенка.

Паведамленьні

Сёньня Менская чырвонасьцяжная пажарная дружына сьвяткуе 6-годзьдзе атрыманьня чырвонага працоўнага сьцягу. На пляцы Волі адбудуцца манэўры ля будынку гарсавету. Пасьля манэўраў адбудзецца прэміяваньне лепшых дружыньнікаў-ударнікаў.

— 20 жніўня, у 5 гадзін 30 м. увечары (заля пасяджэньняў, 4 паверх). Агітмасавы аддзел ЦК КП(б)Б склікае нараду таварыстваў, якія езьдзілі па пытаньні прасоўваньня тавараў на вёску.

Просьба зьявіцца акуратна.

Ч. В. А. адказнага рэдактара А. МІТЛІН.

Усебеларускі зьезд прафсаюзу лесдрэўрабочых

адкрыецца 20-VIII—32 г. у 6 гадз. вечара, у клюбе харчавікоў імя Сталіна (раг. Інтэрнацыянальнай і Камсамольская)

Пасяджэньне фракцыі зьезду

адбудзецца 20-VIII, у 5 гадзін вечара, у клюбе харчавікоў імя Сталіна.

Рэгістрацыя дэлегатаў праводзіцца ў памяшканьні БРК саюзу (Дом Правы, 3-ці паверх, пакой № 5) 19 і 20-VIII з 9 гадз. раніцы.

Прэзыдыум БРК саюзу Лесдрэўрабочых.

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРНА"

Ад чацьвярга 18-га жніўня і штодзенна

НАШУМЕЙШЫ ЗАМЕЖНЫ (ФРАНЦУСКІ) ФІЛЬМ

МУЛЕН-РУЖ

драма ў 6 частках.

Рэжысэр ДЗЮКОН. У гал. ролі О. Чэхава.

Звыш праграмы гукавая кіно-часопіс Саюзкіно.

ШТОДЗЕННА 4 СЕАНСЫ.

ПАЧАТАК сэансаў у 6, 7·30, 9 і 10·30 м.

НАСА—ад 1 г. дня.

Дзеці да 16 год зусім не дапускаюцца.

Менскі хэміка-тэхналёгічны тэхнікум ХАРЧОВА-БРАДЗІЛЬНЫХ ПРАЦЭСАЎ

абвяшчае з 5-VII—32 году па 5-IX—32 г. АСЕНЬНІ НАБОР студэнтаў на аддзяленьні:

1) крухмальна-патачнае на 30 асоб; 2) вінакураннае на 60 асоб; 3) жандзіцерскае на 30 асоб.

Тэхнікум з 3-гадовым навучаньнем рыхтуе тэхнікаў-тэхналёгаў пераліччаных галін прамысловасьці. Умовы прыёму тыя-ж, што і для іншых індустрыяльных тэхнікумаў. Да заяў з дакумэнтамі абавязкова прыкласьці 2 фотакарткі, паштовых марак на 40 кап. у заяве указаць на якое аддзяленьне жадае паступіць. Усе дакументы падаюць у арыгіналах. Прыём заяў штодзенна ад 10 да 4 гадз. у канцылярыі тэхнікуму, апрача 5, 10, 15, 20, 25 і 30.

Адрас: Менск, Падгорны заз. № 7.

Дырэкцыя тэхнікуму.

ТРЭСТУ БЕЛДЗЯРЖКІНО тэрмінова патрэбны машыністкі НА СТАЛУЮ ПРАЦУ.

Зварачацца: Менск, Савецкая 90, 2-гі паверх (буд. кіно-тэатру „Чырв. Зорка").

У МЕНСКУ мяняю асобную кватэру з 3-х пакояў і кухні ў цэнтры гораду з карыстаньнем фруктовым садам на двары, на 1—2 пакоі ў Маскве. Даведацца па тэлефону 6-42 у тав. Саламонава.

БУХГАЛЬТАР, знаёмы з плянаваньнем, жадае ўзяць самастойную работу па вытарговаварачэньню па тэл. № 1-000 (Пляц Волі, 17, ЦСТПД) д б. ухгальтара ад 9 да 3 г. дня.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"

Сёньня і штодзенна

В. В. МАКСІМАЎ, В. ЧАЙНА і Е. ХАВАНСКАЯ

ў мастацкім фільме

КАПЛІЦА СЬВЯТОГА ІЮНА

драма ў 6 частках.

ПАЧАТАК СЭАНСАЎ: 8 гадз., 7 гадз. 45 м., 6 гадз. 15 м., 11 гадз.

„Пралетары" Дзяцінны дзіцячыя сэансы 22 НЯШЧАСЬЦІ 22 Пачатак у 2 гадз. дня.

„СПАРТАК" Пач.: 7, 8-15, 9-30, 11 г. Каса—з 4 г. — 2-я СЭРЫЯ 2-я — МІС-МЭНД.

Вышаў з друку, рассылаецца падпісчыкам і паступіў у продаж № 10 „БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"

ЗЬМЕСТ НУМАРУ

В. Шаранговіч.—Аб выніках веснавой сяўбы і задачах уборачнай кампаніі.

Лісновіч і Фінгаўз.—Да вынікаў першай усебеларускай канфэрэнцыі партгруп.

Я. Ракаў.—Арганізацыя працы і тэхнічнае нармаваньне.

Барысаўч А. Усьцінаў.—Умацаваць гаспадарча-фінансавае становішча калгасаў.

І. Чарнецкі.—Люксэмбургізма—сьцяг ворагаў Ленінскай нацыянальнай палітыкі (канец).

ДРУКУЕЦЦА І НА ДНЯХ ВЫХОДЗІЦЬ № 11-12 „БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ".

ПРЫКЛАДНЫ ЗЬМЕСТ № 11-12.

А. Б. Рыскін.—Аб практычных мерапрыемствах па выкананьні дырэктыў ЦК УсеКП(б) аб разгортваньні савецкага гандлю і вытворчасьці прадметаў шырспажыву.

М. Дрэгілеў.—Аб зьнішчэньні працілегласьці паміж горадам і вёскай.

Я. Ракаў.—Арганізацыя працы і тэхнічнае нармаваньне (канец).

Г. Аляксандраў.—Мастэчкі БССР у рэканструкцыйны пэрыяд.

Ів. Галодна.—Рашаючаму участку—галоўную ўвагу (з вопыту калгасаў Быхаўскага раёну).

НАРАДА ЗАГ. ФЭС, ШКМ І 4-годак гор. Менску і Менскага раёну

адбудзецца 19-VIII, у 12 гадз. дня, у памяшканьні Дому Асьветы, з наступным парадкам дня: 1) Ход падрыхтоўкі да новага навучальнага году. 2) Аб правядзеньні дня вучобы. 3) Рознае.

Яўка загадчыкаў школ або іх намесьнікаў абавязкова.

Заг. Гарана Зяньковіч.

ТЭРМІНОВА ПАТРЭБНА КВАТЭРА

можна з рамонтам, або з аплатай рамонту і інш. выдаткамі.

Зварачацца: Савецкая, 63, 2-гі паверх выдавецтва „Зьвязда".

ЗАНЯТКІ ў школах-сямігодках 1-й ступені гор. Менску і Менскага раёну ПАЧНУЦЦА 1-га ВЕРАСЬНЯ.

Дзеці ад 7 да 15 год, якія не ахоплены школай і не зарэгістраваны яшчэ ў апошніх, а таксама якія навучаліся ў школах у 1931-32 г., павінны да 25-VIII зарэгістравацца па школах.

Уноў паступаючыя ў школу рэгіструюцца ў бліжэйшых да іх школах, а старыя вучні па сваіх школах.

Рэгістрацыя праводзіцца кожнай школай штодзенна, апрача выходных дзён (5, 10 і г. д.).

Загадчык Гарана Зяньковіч.

Гарком КП(б)Б паведамляе аб сьмерці старога члена Менскай арганізацыі КП(б)Б тав. ГОЛЬДМАНА М. С., якая пасьледвала 16-VIII—32 г.

Вынас цела 18-VIII у 5 гадз. вечара з 1-й савецкай больніцы. Гарком заклікае арганізацыю прыняць удзел у пахаваньні.

Менгарком КП(б)Б.

Партячэйка, заўком і калектыў рабочых і служачых цэнтральнай рамонтна-трактарнай майстэрні з глыбокім жалем паведамляюць аб неспадзяванай сьмерці

Т. ГОЛЬДМАНА М. С.

і выказваюць спачуваньне яго сям'і.

Жонка, сын і родныя выказваюць шчырую падзяку мясцкому і супрацоўнікам кіраўніцтва упаўнаважанага НКЦП СССР пры СНК БССР за аказаную імі ўвагу пры пахаваньні

НЕСТАРУКА А. С.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ

Сэктар кнігагандлю

ВЫШАЎ З ДРУКУ

№ 3 БЛАКНОТ-АГІТАТАРА № 3

Выданьне агітмасавдзелу ЦК КП(б)Б

АБ ХЛЕБАЗАГАТОЎКАХ.

Гатыні дня ні выходзіць БЛАКНОТ-АГІТАТАРА № 4

АБ ШЫРСПАЖЫВЕ

Продаж—ва ўсіх кнігарнях ДВБ, БАКТ'у і райспажыўсаюзаў.

Беларускі Дзяржаўны Інстытут СЬВІНАГАДОЎЛІ

абвяшчае АСЕНЬНІ ПРЫЁМ студэнтаў на 1-шы курс.

Дзённае аддзяленьне—90 асоб.

Вечэрняе аддзяленьне без адрыву ад вытворчасьці—30 асоб.

Прыём заяў жадаючых паступіць у інстытут утварэцца да 1 га верасьня 1932 г.

Заняткі пачнуцца з 1-га кастрычніка.

Студэнты інстытуту забясьпечваюцца інтэрнатам і дзярмстыпэндыяй на 75 проц.

Падрабязныя правілы прыёму—у даведніку НКА Бел. для паступаючых у ВНУ.

Заявы з дакумэнтамі накіроўваць па адрасе: гор. Мінск, Камсамольская, 14—Інстытуту Сьвінагадоўлі.

Дырэктар М. ЭРДМАН.

Навукова-дасьледчым саўгаспаму налгаспаму інстытуту камандырынструкцыі сельскай гаспадарні імя СТАЛІНА

ПАТРЭБНЫ на сталую працу

1. Тэхнічныя работнікі з адукацыяй за семігодку.

2. Статыстыкі са стажам працы ня менш аднаго году і машыністкі, якія добра ведаюць белмову.

Аплата па згодзе.

З прапановамі зварачацца: Широкая, 28, тэл. 14-37, 6-66

БЕЛДЗЯРЖКІНО

АБВЯШЧАЕ, што ПРЫЁМ ЗАЯЎ у Маскоўскі Дзяржаўны інстытут кінэматаграфіі—

працягнут да 5 верасьня.

Умовы прыёму гл. „Зьвязда" ад 21-VI-32 г. за № 138.

ПАТРЭБНЫ

БУХГАЛЬТАР-інструктар, і ПЛЯНАВІК-эканаміст.

Зварачацца: Пляц Волі, 17, (памяш. ЦВК), Цэнтральны Савет т-ва „Прыхільнік Дзяцей", тэл. № 1-000.

Тэлефоны рэдакцыі: Адказны рэдактар — 1-27; сакратарыят — 10-74; сэктары: партыйнага будаўніцтва — 13-80; эканамічна-прамысловы — 13-80; кааперацыі і снабжэньня — 13-80; вайскова-палітычны — 13-80; транспартны — 6-19; сацыялістычнага земляробства — 6-19; замежнай інфармацыі — 6-19; сэктар ударных брыгад — 6-19; лістоў рабочых і калгасьнікаў — 6-19; культурнага будаўніцтва — 6-19, агляду друку — 6-19; бібліяграфія — 6-19; бюро расьсьледваньня — 6-19.

Тэлефоны канторы: Загадчык канторы — 7-81; аддзел аб'яў і бухгальтарыя — 7-81.

Адрас рэдакцыі: Менск, Савецкая, 63.

Менск, друкарня «Зьвязда»

Гадавіна № 337.